Шчыры роздум і дыскусія.

СТАР.2

Як ксяндзы ў футбол гулялі.

СТАР.3

На што “вядуцца” мужчыны?

СТАР.6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 САКАВІКА 2014 г. СУБОТА № 39 (27649) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МІКРАПАЗЫКІ — ЦЫВІЛІЗАВАНА

У Беларусі плануецца нарматыўна ўрэгуляваць дзейнасць мікрафінансавых арганізацый. Адпаведны праект указа абмяркоўваўся 28 лютага на рабочай сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з прэм'ер-міністрам Міхаілам Мясніковічам і старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Надзеяй Ермаковай, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

«Я двойчы вяртаў гэты праект указа, патрабуючы ад вас яго абгрунтавання. Што мяне насцярожвае: у свой час мы гераічна змагаліся з фінансавымі кампаніямі, у народзе іх называлі «фінкамі», яны нямала бед прынеслі краіне, а маглі б прынесці яшчэ больш, калі б мы ў свой час не прыдушылі іх дзейнасць, заснаваную на крадзяжы, вывадзе грошай, пірамідах і гэтак далей», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка паставіў пытанне аб неабходнасці прыняцця такога ўказа. «Вы гэта тлумачыце тым, што ў нас гэтыя мікрафінансавыя арганізацыі ўжо існуюць. Паўстае пытанне: яны што, незаконна існуюць? Чаму яны існуюць, на якой падставе, калі для іх няма нарматыўна-прававой базы? Калі яны існуюць сёння законна, то які сэнс нам прымаць яшчэ адзін нарматыўна-прававы акт? — сказаў Прэзідэнт. — Я яшчэ раз падкрэсліваю: я не адхіляю тое, што вы прапануеце, але ў мяне недастаткова інфармацыі, каб прымаць рашэнне».

Надзея Ермакова далажыла, што ініцыятыва падрыхтоўкі адпаведнага дакумента зыходзіла ад Нацбанка. Яна растлумачыла, што мікрафінансаванне прадугледжвае прадастаўленне невялікіх пазык тым ці іншым фізічным або юрыдычным асобам за кошт сродкаў, сфарміраваных самімі ўласнікамі, а не прыцягнутых ад насельніцтва або юрыдычных асоб, як у банках. Грамадзянскім кодэксам гэта прадугледжана, але гэта пытанне трактуецца даволі шырока. А іншае заканадаўства, якое больш канкрэтна рэгулявала б адпаведную дзейнасць, адсутнічае.

«Таму сёння не забаронена любым арганізацыям, якія рэгіструюцца як суб'екты гаспадарання, як прадпрымальніцкія структуры, малы бізнес у тым ліку. Нідзе не прапісана, што прадастаўленне пазык павінна ліцэнзавацца. І таму калі яны рэгіструюцца, складаюць свой статут, яны гэту дзейнасць не прадугледжваюць, таму што яна ўзаконена Грамадзянскім кодэксам. Ліцэнзаванне трэба для таго, каб паставіць у рамкі гэту дзейнасць», — адзначыла старшыня праўлення Нацбанка.

Паводле слоў Надзеі Ермаковай, адсутнасць належнага рэгулявання ў гэтай сферы ў тым ліку стварае пагрозу дзейнасці па прынцыпе так званых фінансавых пірамід, якія прыцягваюць сродкі насельніцтва, а затым проста знікаюць. «Сёння зноў прыходзяць структуры, як правіла, з Расіі, якія там ужо сфарміраваліся. Недзе і махлярская ў іх ёсць гісторыя», — сказала старшыня праўлення Нацбанка.

З іншага боку, ёсць мікрафінансавыя арганізацыі, што прадастаўляюць пазыкі насельніцтву пад вялікія працэнтныя стаўкі, якія часам даходзяць да 1000 працэнтаў гадавых. «Насельніцтва ідзе на гэта, хоць потым вяртанне гэтых грошай, вядома, вельмі складанае і сур'ёзнае», — адзначыла старшыня праўлення Нацбанка.

Па выніках абмеркавання ў кіраўніка дзяржавы праект адпаведнага ўказа, які прызначаны рэгуляваць дзейнасць мікрафінансавых структур, будзе ў бліжэйшы час дапрацаваны.

Як адзначыла Надзея Ермакова, гэтыя арганізацыі прадугледжваецца рэгістраваць у Нацыянальным банку, і адначасова будзе выдавацца ім ліцэнзія. «Будзе рэгулявацца, каб у гэтай арганізацыі быў статутны капітал, адпаведныя працэнтныя стаўкі, каб штрафныя санкцыі не былі завоблачных памераў», — сказала яна.

Пад кантроль будзе таксама паставлена адпаведнасць кіраўнікоў такіх структур з пункту гледжання адукацыі, дзелавой рэпутацыі, наяўнасці судзімасцяў.

НЯСТРАЧАНАЕ РАМЯСТВО

Фота БЕЛТА.

Іванаўская дзіцячая школа мастацтваў народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці спецыялізуецца на навучанні юных бондараў. Навучальная ўстанова была створана ў 2000 годзе як школа бондарства. Бочкі, кадкі, бойкі, каўшы, куфлі і шмат якія іншыя бандарныя вырабы, выкананыя рукамі іванаўскіх дзяцей, экспануюцца на беларускіх і замежных выставах. У 2009 годзе школа атрымала прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». Цяпер у ёй трохгадовае навучанне праходзяць 58 будучых майстроў-бондараў.

ЦЫТАТА ДНЯ

Людміла СТЭФАНОВІЧ, начальнік упраўлення развіцця банкаўскіх плацежных картак і электронных грошай Нацыянальнага банка:

«Нацбанк унёс прапановы Міністэрству па падатках і зборах па максімальным пашырэнні кола аб'ектаў, якія абавязаны ўстанаўліваць плацежныя тэрміналы. Ёсць адпаведная пастанова і пералік аб'ектаў. Гэты спіс трэба пашырыць, і мы прапануем ахапіць практычна ўсе аб'екты. Аплатныя тэрміналы прапануецца ўсталёўваць у аўтамабілях таксі, у арганізацыях, якія аказваюць фізкультурна-аздараўленчыя і спартыўна-масавыя паслугі, на станцыях тэхнічнага абслугоўвання транспартных сродкаў, у санаторыях, базах адпачынку. У чалавека павінен быць выбар — або наяўныя, або безнаяўныя».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.03.2014 г.

Долар ЗША	9770,00	▲
Еўра	13400,00	▲
Рас. руб.	270,50	■
Укр. грыўня	939,42	▲

■ Падатковы разлік

ПАРУШЫЎ — ПЛАЦІ БОЛЬШ

Нямэтавае выкарыстанне ўчастка павялічвае зямельны падатак у 10 разоў

Сёлета ў Падатковы кодэкс Беларусі ўнесены змены, якія закранулі ў тым ліку парадак вылічэння і выплаты падатку на нерухомасць, зямельнага і экалагічнага падаткаў. Аб гэтых новаўвядзеннях падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА паведаміла кансультант упраўлення прамога падаткаабкладання галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання арганізацый Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Таццяна КАВАЛЬЧУК.

На «падатковы» аловак узялі «недабуды» і біяпрыбіральні

З гэтага года падаткам на нерухомую маёмасць абкладаюцца, у тым ліку, і будынкі, збудаванні, якія не падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі (напрыклад, зборна-разборныя будынкі, біяпрыбіральні і г.д.), а таксама будынкі, збудаванні і перадатачныя прылады, якія адлюстраваны як у складзе асноўных сродкаў, так і на іншых рахунках бухгалтарскага ўліку.

Падатковы кодэкс стаў цяпер больш уважлівa «прыглядацца» да праблемнага будаўніцтва. Так, унесены змены, згодна з якімі аб'ектамі звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва прызнаюцца, у тым ліку, будынкі, збудаванні і перадатачныя прылады, якія ўзводзяцца па праекце на рэканструкцыю, у выпадку перавышэння па іх устаноўленых праектнай дакументацыяй тэрмінаў.

У мэтах вылічэння падатку на нерухомасць аб'ектам звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва прызнаецца кожны новы будынак, узвядзенне якога можа складаць толькі частку аб'екта будаўніцтва. Па заканчэнні будаўніцтва ў бухгалтарскім уліку такія будынкі і збудаванні ўтвараюць новыя інвентарныя аб'екты. А вось будынкі і збудаванні, якія не ствараюцца, а толькі змяняюцца ў працэсе правядзення рэканструкцыі або мадэрнізацыі, гэта значыць, фактычна знаходзяцца на рэканструкцыі або мадэрнізацыі, не разглядаюцца ў якасці аб'ектаў абкладання падаткам на нерухомасць як капітальныя будынкі і збудаванні звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва.

Калі пры ажыццяўленні комплексу работ, якія, згодна з праектам, класіфікаваны як «рэканструкцыя», апроч змены ўжо існуючых будынкаў і збудаванняў, ствараюцца (узводзяцца) новыя будынкі і збудаванні, то пры перавышэнні нарматыўных тэрмінаў, вызначаных у праектнай дакументацыі, яны прызнаюцца аб'ектамі звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва, і па іх неабходна вылічваць і выплачваць падатак на нерухомасць па стаўцы 2%.

СТАР.2

■ Курсавая розніца

Адваротны бок медаля глабалізацыі

Падзеі ва Украіне адбіліся на стане эканомікі не толькі нашай паўднёвай суседкі, але і многіх удзельнікаў сусветнага валютнага рынку.

Больш за ўсіх пацярпеў і без таго слабы расійскі рубель. Менш сітуацыя паўплывала на адзіную еўрапейскую валюту. Аднак ва ўсім свеце спрэчныя пытанні, што ўзнікаюць паміж Еўрапейскім саюзам і Расіяй успрымаюцца як новая «халодная вайна». Ёсць погляд, што больш жорсткія пазіцыі Масквы могуць прывесці да праблем з пастаўкамі нафты і газу, а гэта негатыўна паўплывае на аднаўленне эканомікі еўразоны (у прыватнасці, на курс еўра). Вось вам і адваротны бок глабалізацыі. Пакуль ЕС няма чаго хвалявацца, бо еўра падтрымлівае перавод капіталу з рынкаў, якія развіваюцца, у Еўропу. Вось толькі карэктывы можа ўнесці яшчэ адзін канфлікт — у Крыме. Хаця сітуацыя з Крымам больш паўплывае на расійскі рубель.

А ва Украіне пакуль спрабуюць выратаваць эканоміку ад дэфолту. Золатавалютныя рэзервы знізіліся, а ўкладчыкі сталі забіраць з банкаў свае дэпазіты. У сувязі з гэтым Нацбанк Украіны ўвёў часовае абмежаванне на зняцце валютных укладаў (не больш за 15 тысяч грыўняў у эквіваленце за суткі). Аднак для грыўневых дэпазітаў абмежаванняў няма: «Здымайце хоць мільён, хоць два. Банкі ліквідныя», — заявіў кіраўнік галоўнага банка нашай суседкі Сцяпан Кубіў.

На такім фоне пазітыўнай навіной за апошні тыдзень успрымаецца толькі падаражэнне золата. Яго інвестыцыйная прывабнасць захоўваецца з першых дзён новага года. Прагназуецца, што цана на золата будзе расці і надалей. Можа, і правільна. А то валютам давяраць нельга.

У Беларусі ж за гэты тыдзень падаражэў долар на 40 рублёў (плюс 0,4%) да 9770. Еўра дадаў 60 рублёў (плюс 0,45%) да 13400. Толькі расійскі рубель патаннеў яшчэ на 2,5 грашовай адзінкі (мінус 0,9%) да 270,5.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Сярэднія працоўныя пенсіі павялічыліся сёлета на 5,2%

У лютым у Беларусі ў чарговы раз былі пералічаны працоўныя пенсіі. Сярэдні ўзровень такой дапамогі, выплачанай у лютым, дасягнуў адзнакі ў 2 мільёны 352 тысячы рублёў, паведамляе БелТА.

Выраслі і велічыні іншых відаў пенсій. Так, памер сярэдняй дапамогі па інваліднасці дасягнуў 2 мільёнаў 130 тысяч рублёў, а, напрыклад, за выслугу гадоў ён большы на 990 тысяч. Максімальная пенсія па ўзросце для працуючых атрымальнікаў склала 2 мільёны 660 тысяч рублёў. А вось сацыяльная пенсія павялічылася ў працэнтных суадносінах нават крыху больш за працоўную. Звязана гэта было з традыцыйным лютаўскім пераглядам бюджэту пражыткавага мінімуму,- які вырас на гэты раз на 7,7%. Зараз памер гэтай дапамогі складае 1 мільён 40,6 тысячы рублёў.

Усяго ж павышэнне памеру пенсій закранула два з паловай мільёны жыхароў Беларусі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

■ Духоўнасць

ЗАЎТРА ДАРАВАЛЬНАЯ НЯДЗЕЛЯ

Святкуючы Масленіцу, прыгадваючы старадаўнія гульні і забавы, не варта забываць і пра хрысціянскія традыцыі — з панядзелка пачынаецца Вялікі пост.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Протаіерэй Яўген СВІДЗЕРСКІ расказаў карэспандэнту «Звязды» пра тое, які сэнс надае Масленіцы праваслаўная царква і як раіць правесці бліжэйшыя дні. Ён адзначыў, што Масленіцай у царкоўным календары называецца апошні тыдзень перад Вялікім постам. У прастамоўі яго называюць яшчэ масленым, а ў царкоўным ужытку — сырным. Такія назвы паходзяць ад тых харчовых абмежаванняў, якія існуюць у гэты час і папярэднічаюць Вялікаму посту. Перад масленым тыднем заканчваецца мясаед, таму царква не адразу, а паступова адвучае вернікаў ад скаромнага.

Тое, што звязана з нейкімі традыцыямі і рытуаламі ў перыяд Масленіцы, мае паганскія карані, заўважае протаіерэй, таму царква іх ніякім чынам не апраўдвае. Па-першае, народныя гулянні, забаўляльныя конкурсы, што лічацца «традыцыйнымі», насамрэч такімі не з'яўляюцца. Калі казаць аб провадах зімы ў народнай традыцыі, то яны праходзілі ў дзень вясенняга раўнадзенства і мелі іншую назву — Камаедзіца. Многія лічаць, што Масленіца была адзіным язычніцкім святам нашых продкаў, якое прыняла царква. Аднак святар тлумачыць, што правільней казаць пра тое, што некаторыя народныя звычаі (у тым ліку провады зімы) былі хрысціянізаваны. Гэта значыць, пэўныя традыцыі павінны былі набыць хрысціянскі сэнс і пазбавіцца былой забабоннасці.

Сама назва Масленіцы звязана з тымі прадуктамі, якія царква бласлаўляе есці ў гэты час: сыр, масла, малако, яйкі. Ёсць традыцыя прыходзіць «на бліны» да сяброў перад постам, бо пасля зносіны будуць абмежаваныя. Многія вернікі займаюцца ў гэты час падрыхтоўкай. Бо гаспадыням будзе не так проста забяспечыць сваіх дамачадцаў поснымі стравамі на стале, каб гэта было смачна і не вельмі аднастайна. Асабліва на першым тыдні, які пачынаецца з наступнага панядзелка, самым строгім.

Да таго ж перад пачаткам посту неабходна прымірыцца з усімі сваімі крыўдзіцелямі, нагадвае святар. А для некаторых людзей гэта раўнасільна подзвігу. Тут без дапамогі Бога, без царкоўных малітваў не абысціся. Але ж сапраўды змірыцца і ачысціцца атрымаецца толькі тады, калі сэрца свабоднае ад крыўды.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЯНУКОВІЧ: ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА 25 МАЯ НЕЗАКОННЫЯ

Учора ў Растове-на-Доне Віктар Януковіч правёў прэс-канферэнцыю. Удзел у ёй узяло каля 200 журналістаў.

Паводле слоў Януковіча, ён мае намер працягнуць барацьбу за будучыню Украіны «супраць тых, хто страхам і тэрорам спрабуе асядлаць яе. Уладу ў краіне захапілі нацыяналістычныя прафашысцкія малойчыкі, якія прадстаўляюць абсалютную меншасць насельніцтва Украіны», сцвярджае Януковіч. На яго думку, трэба правесці расследаванне злачынстваў ва Украіне пад кантролем грамадскасці і Савета Еўропы. Выбары ў маі Януковіч лічыць незаконнымі і таму не збіраецца браць у іх удзел. Пра сваё знікненне з Украіны адхілены Радай прэзідэнт заявіў наступнае: «Ніхто мяне не звергнуў, я вымушаны быў пакінуць Украіну пад непасрэднай пагрозай свайму жыццю і жыццю маіх блізкіх... Я атрымаў званкі пра пагрозы членам сваёй

сям'і...» Таксама Януковіч заявіў пра абстрэл яго аўтамабіля і пагрозу збіць верталёт, на якім ён накіроўваўся на ўсход Украіны. Сваё знаходжанне ў Растове-на-Доне ён патлумачыў тым, што ў гэтым горадзе жыве яго сябар, і паабяцаў вярнуцца ва Украіну, як толькі будуць выкананыя ўмовы бяспекі.

Падрабязна Віктар Януковіч спыніўся на пагадненні з апазіцыяй, якое павінна было ўрэгуляваць крызіс. «Я верыў у прыстойнасць замежных пасярэднікаў. Нягледзячы на тое, што гэтае пагадненне... было досыць супярэчлівым і складаным, я яго падпісаў. І падпісалі лідары апазіцыі. Сапраўды яно ў той час было вельмі важным. Яно прадугледжвала, што радыкальныя сілы павінны былі разброіцца, вызваліць усе захопленыя тэрыторыі, але гэта не было выканана. У выніку Кіеў быў наводнены ўзброенымі людзьмі, якія пачалі граміць дамы. Пачалі пакутаваць невінаватыя людзі. Гэта працягваецца і цяпер. Таму пагадненне для нас, вядома, давала надзею. Але ўсё, што адбылося далей, цяжка назваць нейкімі эпітэтамі. Гэта беззаконне, тэрор, безуладдзе і хаос, беспрэцэдэнтныя рашэнні, якія прымаліся ў парламенце спосабам гвалту над дэпутатамі, закідвання камянямі. Іх цягалі на Майдан, каб яны там прысягалі. Гэта не работа парламента, гэта работа Майдана. Апазіцыя назвала новы кабінет міністраў «кабінетам перамогі». Перамогі над кім? Над народам? Яраш, Парубій, Цягныбок — людзі, якія прапагандуюць гвалт. Гэта людзі, вядомыя ва ўсім свеце, а ў Ізраілі яны выклікаюць жах. Вярхоўная Рада нелегітымная». У той жа час Януковіч не асуджае тых людзей, «якіх пад дулам аўтаматаў прымушалі прымаць тыя ці іншыя рашэнні. Гэта рэалій, якія зараз ёсць у Кіеве. Мне ўдалося пагутарыць з некаторымі з іх: тое, што я ад іх пачуў, гэта жах».

Паводле слоў адхіленага Радай прэзідэнта, яму сорамна і ён хоча папрасіць прабачэння «перад ветэранамі, перад украінскім народам за тое, што адбылося ва Украіне. За тое, што ў мяне не хапіла сіл, каб утрымаць стабільнасць».

Віктар Януковіч пракаментаваў сітуацыю, якая складваецца на Крымскім паўвостраве. «Гэта натуральная рэакцыя на той ваенны пераварот, які адбыўся ў Кіеве. Крымчане не будуць падпарадкоўвацца нацыяналістам і бандэраўцам. Як дзейны прэзідэнт Украіны заяўляю, што Крым павінен заставацца ў складзе ўкраінскай дзяржавы, захоўваючы шырокую аўтаномію... Любыя ваенныя дзеянні ў такой сітуацыі недапушчальныя. Я не збіраюся звяртацца па ваенную падтрымку. Украіна павінна заставацца непадзельнай».

Гаворачы пра крызіс у эканоміцы, Януковіч заявіў, што пераддэфолтнае становішча ва Украіне пачалося, калі Украіна фактычна страціла такога важнага партнёра, як Расія. «Я не буду таіць, што мы рыхтаваліся да выбараў 2015 года і, вядома, зрабілі б усё, каб пераканаць украінскі народ, што лепш жыць у стабільнай краіне, якая мае велізарную перспектыву, і колькасць нашых прыхільнікаў была самай вялікай сярод палітычных прадстаўнікоў розных партый. Людзі ў гэта верылі. Мы гэта зрабілі б. Прадстаўнікі Захаду, ЗША, якія апекаваліся Майданам, — гэта яны сёння нясуць адказнасць перад украінскім народам».

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 14039>

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КЛІЧКО І ЦІМАШЭНКА ЗБІРАЮЦЦА БАЛАТАВАЦЦА НА ПАСАДУ ПРЭЗІДЭНТА УКРАІНЫ

Лідар партыі «УДАР» Віталь Клічко пацвярджае свой намер браць удзел у прэзідэнцкіх выбарах ва Украіне 25 мая і заяўляе, што лідар «Бацькаўшчыны» Юлія Цімашэнка яму паведаміла, што таксама мае намер балатавацца на пасаду прэзідэнта. Каментуючы рэпліку аб тым, што фактычна Клічко становіцца канкурэнтам Цімашэнкі, лідар «УДАРа» сказаў: «Я не бачу нічога дрэннага, але вельмі дзіўна будзе выглядаць, калі апазіцыйныя сілы будуць канкурыраваць. І я спадзяюся, што калі гэтая канкурэнцыя будзе, то яна будзе сумленнай, празрыстай і па еўрапейскіх сучасных прынцыпах». Таксама Клічко падкрэсліў, што рашэнне Цімашэнкі балатавацца на пасаду прэзідэнта для яго было нечаканым.

АЛІМПІЙЦАМ ВЫПЛАЧАНЫ ПРЭМІЯЛЬНЫЯ

Беларускім спартсменам, якія заваявалі медалі на XXII зімовых Алімпійскіх гульнях 2014 года ў Сочы, выплацілі прэміяльныя. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада.

«Сёння даручэнне кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі выканана — прызавыя пераведзены на карт-рахункі спартсменаў, а таксама іх трэнераў», — сказалі ў прэс-службе.

Сродкі пералічаны ў замежнай валюце. Сумы прызоў спартсменам, а таксама ўзнагароды трэнерам, якія забяспечылі іх падрыхтоўку, вызначаны Указам Прэзідэнта № 333 ад 25 чэрвеня 2010 года «Аб некаторых мерах па падрыхтоўцы беларускіх спартсменаў да Алімпійскіх, Паралімпійскіх і Дэфлімпійскіх гульняў».

НАЗНАЧАНЫ НАМЕСНІК КАМАНДУЮЧАГА ВОЙСКАМІ ЗАК

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сваім указам назначыў палкоўніка Віктара Хрэніна намеснікам камандуючага войскамі Заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

ЗА ЎЧЫНЕННЕ ПРАВІННАСЦЯЎ

Прэзідэнт Беларусі вызваліў генерал-маёра міліцыі Івана Саўчыца ад пасады начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама за ўчыненне правіннасцяў, якія дыскрэдытуюць званне супрацоўніка органаў унутраных спраў, і звольніў яго са службы ў органах унутраных спраў у сувязі з сістэматычным невыкананнем умоў кантракта. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, адпаведны ўказ Аляксандр Лукашэнка падпісаў 28 лютага.

БУДАЎНІЦТВА ДРУГОЙ КАЛЬЦАВОЙ АЎТАДАРОГІ ВАКОЛ МІНСКА БУДЗЕ ПРАДОЎЖАНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Да таго ж, на думку Прэзідэнта, стварэнне «другога кальца» станоўча паўплывае на экалагічную сітуацыю ў горадзе. «Мы неадкладна павінны пачаць работы па будаўніцтве другой кальцавой дарогі вакол Мінска, каб Мінск не задыхнуўся ў гэтым брудзе, каб 2 млн чалавек, чвэрць насельніцтва нашай краіны, не адчувалі гэтай праблемы. Трэба мець на ўвазе, што ад гэтага і ўсе хваробы. І нам давядзецца плаціць шалёныя грошы для таго, каб лячыць людзей. Гэта таксама не трэба забываць, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Галоўнае тое, што мы атрымаем мінчан, калі ў бліжэйшыя гады не пабудуем гэту дарогу».

Як далажыў прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч, у агульнай колькасці працягласць дарогі складае 85 км, з якіх на першым этапе плануецца пабудаваць 44 км — участак ад Астрашыцкага Гарадка да Аксакаўшчыны. Паводле слоў прэм'ер-міністра, за выключэннем фінансавага боку пытання, падстаў, каб не будаваць аўтадарогу, няма.

Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым адзначыў, што з улікам ужо існуючых участкаў дарогі будаўніцтва будзе не такім фінансава затратным. «А калі ўзяць усе пытанні пад кантроль і эканоміць грошы, то мы яе можам пабудаваць, — лічыць Прэзідэнт. — Цяжка будзе заўсёды, грошай заўсёды не хапае, і пры гэтым я прашу ўлічыць: вы помніце, як абуралася нейкая частка насельніцтва ў сувязі з тым, што мы збіраем транспартны збор. Майце на ўвазе — усе гэтыя грошы павінны пайсці на дарогі. Ні на якія іншыя патрэбы — толькі на дарогі! У адваротным выпадку крытыка народа будзе абгрунтаванай. За гэта ўрад адкажа. Усе грошы, сабраныя ад гэтага транспартнага падатку, павінны быць укладзены ў дарогі».

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што, выконваючы даручэнне кіраўніка дзяржавы, сродкі канцэнтраваліся на тое, каб зрабіць максімальна добрую і камфортную сувязь з абласнымі цэнтрамі і іншымі буйнымі гарадамі. За тры гады было пабудавана 344 км дарог рэспубліканскага значэння выдатнай якасці, пры гэтым за ўсю папярэднюю пяцігодку — 328 км. У бягучым годзе плануецца ўвесці яшчэ 104 км дарог.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што неабходна прывесці ў належны стан і трасы ад Мінска ў напрамку Гродна і Віцебска, па прыкладу таго, як гэта было зроблена ў напрамку іншых абласных цэнтраў, а таксама беларускі ўчастак дарогі Адэса — Санкт-Пецярбург.

Што датычыцца другой кальцавой аўтадарогі вакол Мінска, то Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што яна праектуецца па першай катэгорыі, што прадугледжвае інтэнсіўнасць руху ад 10 тыс. аўтамабіляў у дзень. Напрыклад, існуючая кальцавая аўтадарога сёння прапускае каля 90 тыс. аўтамабіляў, гэта значыць нагрузка на яе ў 9 разоў перавышае мінімальную адзнаку для першай катэгорыі дарог.

Паводле слоў міністра транспарту і камунікацый Анатоля Сівака, работы па стварэнні «другога кальца» пачаты, аднак да гэтага часу вяліся недастатковымі тэмпамі.

У ходзе даклада была вызначана стратэгія будаўніцтва аўтадарогі на гэты і наступныя гады, а таксама ўчасткі, дзе работы будуць весціся інтэнсіўна. Акрамя таго, ішла размова аб крыніцах фінансавання, прыцягненні ў тым ліку прыватных сродкаў з дарожнага збору. З 1 сакавіка будзе прадоўжана будаўніцтва дарогі на тых участках, дзе ўжо былі пачаты падрыхтоўчыя работы, і ў 2014 годзе плануецца ўвесці першыя 20 км другой кальцавой аўтадарогі.

КАРАТКА

Пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў пройдзе ў Маскве 11 сакавіка.

Масленічныя кірмашы пройдуць у Мінску 1-2 сакавіка. Самы вялікі кірмаш пройдзе 1 сакавіка каля Палаца спорту на праспекце Пераможцаў. Сваю прадукцыю прадставяць ААТ «Белрыба», Мінскі камбінат хлебапрадуктаў, ААТ «Камунарка», УП «Мінскі мясакамбінат», КУП «Мінскхлебпрам» і іншыя.

Беларусь у 2013 годзе наведалі 136,8 тыс. чалавек, што на 15,2 працэнта больш, чым у 2012 годзе.

СЛОВАМ І СПРАВАЙ

Жывыя стасункі ў ідэалагічнай рабоце надзвычай важныя

У Брэсце прайшоў семінар ідэалагічнага актыву «Асаблівасці ідэалагічнай работы ў сучасных умовах»
Падчас наведвання грамадскай прыёмнай абласной арганізацыі РГА «Белая Русь», першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр РАДЗЬКОЎ адзначыў, што грамадская прыёмная аказалася запатрабаванай формай работы з насельніцтвам. Старшыня абласной арганізацыі «Белая Русь» Пётр Пойта расказаў, з якімі пытаннямі найчасцей сюды прыходзяць людзі. З пачатку года ў грамадскую прыёмную, дарэчы, паступіла 28 зваротаў грамадзян.

Фота БЕЛТА.

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар і Аляксандр Радзькоў сустрэліся з кадравым рэзервам аблвыканкама. З маладымі людзьмі кіраўнік «Белай Русі» ўжо сустракаўся на адным з семінараў у 2011 годзе і з задавальненнем адзначыў, што яны даволі значна выраслі прафесійна.

Падчас сустрэчы з насельніцтвам у ЖЭС-10 Брэста праблемы ўзніміліся розныя, былі і даволі вострыя. Усе ўдзельнікі дыялогу атрымалі кампетэнтныя адказы.

На задачах ідэалагічнага актыву ў сучасных умовах акцэнтаваў увагу Канстанцін Сумар падчас пленарнага пасяджэння. «Людзі нармальна ўспрымаюць інфармацыю аб тым, чаму не вырашаюцца асобныя праблемы, трэба толькі аргументавана і своечасова тлумачыць ім. З людзьмі трэба гаварыць», — заўважыў губернатар Брэстчыны. Кіраўнік вобласці лічыць вельмі важным выкарыстанне інтэрактыўных формаў работы. Напрыклад, з дапамогай інтэрнэту цяпер можна правесці вучобу кадраў, не адрываючы іх ад вытворчасці на курсы павышэння кваліфікацыі.

Больш за тое, проста падчас семінару прайшоў відэапрыём грамадзян губернатарам. У студыі сваіх гарадоў прыйшлі жыхары Маларыты, Пінска, Баранавіч. Прагучалі пытанні аб пагаршэнні экалагічнай абстаноўкі ў Маларыце, выкліканай ростам патоку велікагрузнага транспарту, аб далейшым лёсе маленькай бібліятэкі ў Пінску, а таксама жыллёвае пытанне.

«Наша слова павінна падмацоўвацца справай», — не раз прагучала ў ходзе семінара ідэолагаў. Выступоўцы гаварылі аб неабходнасці стварэння здаровай, кансалідуючай атмасферы ў працоўных калектывах. Пра патрыятызм як кансалідуючую сілу грамадства гаварыў таксама старшыня Брэсцкага аблвыканкама ў кантэксце апошніх публікацый вакол Брэсцкай крэпасці, калі амерыканскія журналісты дазволілі сабе непрыстойна гумарыць наконт помнікаў: «Людзі прыходзілі ў крэпасць, пісалі ў газеты, на сайты, адгукнуліся грамадзяне розных краін, хоць ніхто нікога не прасіў аб гэтым. І мы разам адстаялі паважлівую памяць пра нашу святыню».

Вынікі семінара падвёў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў. Аляксандр Міхайлавіч падкрэсліў: «Сёння мы яшчэ раз упэўніліся, што жывыя стасункі ў ідэалагічнай рабоце надзвычай важныя. Вы прыедзеце ў свае раёны, раскажаце, што чулі, пра што гаварылі з калегамі. Магчыма, з нечым не пагодзіцеся. І гэта будзе сумленна. Але ваш шчыры роздум і дыскусія з аднадумцамі паспрыяюць пошуку адзіна правільнага рашэння».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

СВАІМІ ДУМКАМІ ПАДЗЯЛІЛІСЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ СЕМІНАРУ

Марыя ГЛАДУН, старшыня Маскоўскай раённай арганізацыі РГА «Белая Русь» г. Брэста:

— Мерапрыемства можна разглядаць у сістэме агульнай работы з ідэалагічным актывам. Падобныя мерапрыемствы каштоўныя тым, што мы можам атрымаць інфармацыю з першых вуснаў, паслухаць калег, падзяліцца вопытам. На працягу дня была магчымасць з таварышамі па грамадскім аб'яднанні абмеркаваць будучую выбарчую кампанію. У нашым раёне, напрыклад, 86 выбарчых участкаў. У складзе кожнай камісіі ёсць прадстаўнікі «Белай Русі». Пры гэтым абсалютную большасць з іх вылучылі працоўныя калектывы, што гаворыць аб аўтарытэце членаў аб'яднання. Акрамя таго, на кожны ўчастак мы намераны накіраваць сваіх назіральнікаў.

Мікалай АНТАНОЎСКІ, галоўны рэдактар Пружанскай газеты «Раённыя будні»:

— Прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі пабывалі ў рэдакцыях абласных газет, на тэлерадыёкампаніі. Калегі паказалі даволі цікавыя напрацоўкі ў плане падачы інфармацыі, ажыццяўленні медыйных праектаў.

Аляксандр ЗАЗУЛЯ, старшыня Кобрынскага райвыканкама:

— У нашым жыцці вельмі важна не падмяняць жывую работу з людзьмі яе імітацыяй. Прамы дыялог з працаўнікамі, асабліва на сяле, дае вельмі важкія вынікі, здымае напружанасць, паскарае вырашэнне праблем. Я падзяліўся гэтымі поглядамі з калегамі і знайшоў аднадумцаў.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

НЕЗАКОННА ЗНЯТЫЯ СРОДКІ БАНК ВЕРНЕ НА ПРАЦЯГУ 30 ДЗЁН?

Нацыянальны банк рэкамендаваў банкам у выпадках спісання грашовых сродкаў без згоды трымальніка банкаўскай аплатнай карткі і адсутнасці пры гэтым у банка інфармацыі аб махлярстве з боку кліента кампенсаваць грашовыя сродкі на працягу 30 дзён з дня атрымання заявы кліента пры выкарыстанні банкаўскай карткі на тэрыторыі Беларусі і на працягу 60 дзён пры правядзенні аперацыі за межамі Беларусі. Пра гэта паведаміла **начальнік упраўлення развіцця банкаўскіх плацежных картак і электронных грошай Нацыянальнага банка Беларусі Людміла СТЭФАНОВІЧ.**

«Гэта вельмі вялікі крок наперад, тое, пра што заўсёды казалі фізічныя асобы, абмяркоўвалі банкі і праваахоўныя галіны — укараненне прынцыпу нулявой адказнасці», — падкрэсліла яна. Такое рашэнне было прынята Нацбанкам з улікам зваротаў грамадзян і, перш за ўсё, у мэтах захавання даверу насельніцтва да банкаўскай сістэмы, таго, што ўжо дасягнута ў сферы безнаяўных разлікаў. Да таго ж гэта прадыктавана міжнароднай практыкай.

Акрамя таго, нагадаем, што Нацбанк распрацаваў праект нарматыўнага дакумента, якім прапануецца ўстанавіць для насельніцтва гранічную суму плацяжу наяўнымі грашовымі сродкамі на ўзроўні не большым за 1 тысячу базавых велічынь (13,5 тысячы долараў). «Мы лічым, што гэта аптымальная велічыня, хоць некаторыя міністэрствы і ведамствы лічаць, што яе трэба яшчэ змяншаць», — сказала Людміла Стэфановіч.

Паводле інфармацыі БЕЛТА.

АЛЕКСАНДРЫЯ ЗНОЎ ЗБЯРЭ СЯБРОЎ

Сёлета купальскае святкаванне пройдзе пад дэвізам «Дняпро — рака дружбы»

Свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») у аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна адбудзецца сёлета 5-6 ліпеня. Пра гэта паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада па выніках пасяджэння пастаянна дзейнага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні свята, якое прайшло пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Анатоля Тозіка.

У ходзе пасяджэння быў разгледжаны шэраг пытанняў, звязаных з падрыхтоўкай мерапрыемства. У прыватнасці, канцэпцыя правядзення свята, яго праграма, пытанні па арганізацыі работы гандлёвых выстаў і ўдзелу замежных гасцей.

Мерапрыемствы свята пройдуць пад дэвізам «Дняпро — рака дружбы». Пачнуцца яны 5 ліпеня адкрыццём выставы-кірмашу народных майстроў «Вялікі Александрыйскі кірмаш», падчас якога запланавана арганізацыя міні-свята «Сялянскі двор», «Глушанскі хутарок», «Залатая саломка», «Беларускі фарфор» і інш. Пройдуць таксама фестывалі піва, лёну, беларускай бульбы.

Будзе значна пашыраны колькасны склад творчых дэлегацый краін—удзельніц святочных мерапрыемстваў. Госці прымуць удзел у выставах (бізнес-перамовах), арганізатарам якіх выступіць Беларуская гандлёва-прамысловая палата. Адбудзецца прэзентацыя слуцкага пояса і сувенірнай прадукцыі з гэтым таварным знакам.

Па выніках пасяджэння арганізацыйнага камітэта зацверджаны план мерапрыемстваў па яго падрыхтоўцы, дадзены адпаведны даручэнні органам дзяржкіравання і арганізацыям па аказанні садзейнічання ў правядзенні мерапрыемстваў свята на высокім арганізацыйным і творчым узроўні.

НА «ТЭЛЕФОННАГА ТЭРАРЫСТА» ЗАВЯЛІ СПРАВУ

У дачыненні да аўтара sms-паведамлення, праз якога ў сераду тры гадзіны не працавала мінскае метро, распачалі крымінальную справу. Ён абвінавачваецца ў заведама ілжывым паведамленні пра тэракт.

Пра магчымую пагрозу тэракта супрацоўнікі аховы метрапалітэна даведаліся ад пасажыркі. Апошняя выпадкова прачытала sms-ку, якую набраў на сваім мабільным тэлефоне мужчына, што стаяў побач з ёй у вагоне. Дзяўчына сцвярджала, што малады чалавек збіраецца падарваць метро.

Метро тут жа закрылі, а для таго, каб зменшыць нязручнасці пасажыраў, выдзелілі дадатковыя тралейбусы, трамваі і аўтобусы.

— Інфармацыя аб існаванні выбуховага прыстасавання, якое магло б пагражаць жыццю і здароўю людзей, не пацвердзілася, — распавёў афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Мінску Аляксандр Герасімаў. — Праз тры гадзіны, дзякуючы фотаздымкам з камер відэаназірання, затрымалі аўтара паведамлення.

Ім аказаўся 35-гадовы жыхар Мінскай вобласці, ураджэнец Караганды. Пакуль што вядома толькі тое, што жартаўлівае паведамленне з пагрозай выбуху ён адправіў сваёй дзяўчыне. Падрабязней пра матывы падазраванага следчыя паабяцалі паведаміць пазней.

Варта дадаць, што жартаўніку, згодна з заканадаўствам, пагражае максімальна да пяці гадоў турмы. Акрамя таго, яму, хутчэй за ўсё, давядзецца кампенсаваць урон, які панеслі метрапалітэн і Мінсктранс з-за яго розыгрышу.

Надзея ПАЎЛАВА.

БЕЛАРУСЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў ЗАХАВАННІ УКРАІНЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ І ТЭРЫТАРЫЯЛЬНА ЦЭЛАСНАЙ

Беларусь зацікаўлена ў тым, каб Украіна заставалася суверэннай, незалежнай, тэрытарыяльна цэласнай дзяржавай. Аб гэтым заявіў журналістам міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей па выніках сустрэчы 27 лютага ў Рызе з кіраўніком знешнепалітычнага ведамства Латвійскай Рэспублікі Эдгарсам Рынкевічсам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе МЗС.

Уладзімір Макей падкрэсліў: «Мы негатыўна ацэньваем тое, што адбываецца цяпер ва Украіне. Украіна — наш паўднёвы сусед, у нас у мінулым годзе тавараабарот быў $7 млрд, у пазамінулым — $8 млрд. Мы цесна звязаны гандлёва-эканамічнымі сувязямі і гаворым практычна на адной мове — разумеем адзін аднаго, калі размаўляем на ўкраінскай або беларускай мовах, нашы народы абсалютна блізкія. Таму мы ўспрымаем тое, што адбываецца ва Украіне, я сказаў бы, як трагедыю і, зразумела, шкадуем аб ахвярах ва Украіне. Мы абмяркоўвалі гэта пытанне. Мы зацікаўлены ў тым, каб Украіна засталася суверэннай, незалежнай, тэрытарыяльна цэласнай дзяржавай».

Ён прадоўжыў: «Не варта, напэўна, цяпер вяртацца ў мінулае і гаварыць аб тым, хто мае рацыю, а хто вінаваты, але я лічу, што на нейкім этапе — да Вільнюскага саміту «Усходняга партнёрства» або адразу пасля яго — маглі б быць зроблены адпаведныя крокі, якія не дапусцілі б гэтай трагедыі. Гэта датычыцца ўсіх бакоў, уключаных у гэты працэс. Але адбылося тое, што адбылося. Цяпер, як нам здаецца, самае галоўнае — аднавіць стабільнасць, не дапусціць далейшага кровапраліцця, забяспечыць функцыянаванне адпаведных органаў улады, якія павінны быць легітымнымі. Самае важнае — захаваць тэрытарыяльную цэласнасць, суверэнітэт і незалежнасць Украіны». Уладзімір Макей адзначыў, што Беларусь зыходзіць з таго падыходу, што Украіна — вельмі важны яе партнёр.

ПАРУШЫЎ — ПЛАЦІ БОЛЬШ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дапоўнены пералік ільгот па падатку на нерухомасць: сёлета з 1 студзеня не абкладаюцца ім капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, машына-месцы, якія належаць на праве ўласнасці грамадскаму аб'яднанню «Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь».

Зямлю трэба паважаць

Заканадаўства па зямельным падатку сёлета істотна не змянілася, але... Варта адзначыць, што стаўкі зямельнага падатку, устаноўленыя ў беларускіх рублях, у 2014 годзе павялічаны ў сярэднім на 12,7%. У прыватнасці, цяпер падраслі стаўкі зямельнага падатку ў дачыненні да ўчасткаў, якія выкарыстоўваюцца для арганізацыі аўтамабільных рынкаў, з 0,55% да 3% ад кадастравага кошту.

З пачатку года былі праіндэксаваны стаўкі зямельнага падатку на землі сельскагаспадарчага прызначэння. Эксперты праіндэксавалі стаўку па такіх «вясковых» землях, якія сёння занятыя капітальнымі будынкамі і іншымі аб'ектамі. З 1 студзеня яна складае 5 690 рублёў за 1 гектар.

Шмат пытанняў узнікала па ўчастках, якія выкарыстоўваліся не ў адпаведнасці з мэтай іх прадастаўлення. Падобных парушальнікаў землеўпарадкавальныя службы мясцовых выканаўчых камітэтаў цяпер пачнуць караць рублём шматкратных падаткаў. Сёлета на зямельныя ўчасткі, якія выкарыстоўваюцца не па мэтавым прызначэнні, прымяняюцца стаўкі зямельнага падатку па фактычным функцыянальным выкарыстанні, павялічаныя на каэфіцыент 10.

Пенсіянеры па ўзросце, інваліды I і II групы і іншыя непрацаздольныя фізічныя асобы маюць права на льготы па зямельным падатку ў дачыненні да зямельных участкаў, якія размешчаны не па месцы іх жыхарства і прадастаўлены такім асобам для гаражнага будаўніцтва. Па гэтым пытанні ўдакладняецца адзін слушны момант. Так, зямельным падаткам абкладаецца ўся плошча зямельнага ўчастка, якая прадстаўлена арганізацыі для будаўніцтва і эксплуатацыі гаражоў. Пры гэтым арганізацыя вызваляецца ад выплаты зямельнага падатку ў частцы плошчы зямель, якая прыходзіцца на фізічных асоб-ільготнікаў. Атрымліваецца, што ад зямельнага падатку будзе вызваляцца не толькі плошча зямельнага ўчастка пад гаражамі, якія належаць такім фізічным асобам, але і плошча, якая прыходзіцца на месцы агульнага карыстання.

Экападатак стаў больш зразумелым

Падатковыя службы сур'ёзна спрасцілі алгарытм вылічэння экалагічнага падатку. Асаблівая ўвага нададзена ўдасканаленню аднаго з плацяжоў, якія ўваходзяць у склад экалагічнага падатку, — экалагічнаму падатку за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра. Цяпер падатковая база экалагічнага падатку вызначаецца праз фактычныя аб'ёмы выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад стацыянарных крыніц, калі апошнія ўказаны ў дазволах на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра або комплексных прыродаахоўных дазволах.

Такім чынам, цяпер пад аб'ект абкладання экалагічным падаткам практычна падпадаюць толькі тыя выкіды, што ўтвараюцца стацыянарнымі крыніцамі, у дачыненні да якіх атрыманы дазволы на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра або якія пазначаны ў комплексных прыродаахоўных дазволах.

Выкіды забруджвальных рэчываў, якія ажыццяўляюцца нестацыянарнымі крыніцамі або стацыянарнымі крыніцамі, па якіх не патрабуецца атрымання адпаведнага дазволу, экалагічным падаткам не абкладаюцца. У новай рэдакцыі спецыялісты выключылі паніжальны каэфіцыент 0,5 да ставак экалагічнага падатку, які ўжываўся пры разліку падатку на выкіды, якія ўтвараліся пры згаранні біягазу і біяпаліва.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

ЧАРГОВАЯ АХВЯРА

У сталіцы чарговай ахвярай «маркі» — прамочанага псіхатропным рэчывам аркуша паперы, які выступае ў якасці гатовай да ўжывання дозы, — стаў 24-гадовы мінчанін.

Паводле інфармацыі прэс-службы ГУУС Мінгарвыканкама, малады чалавек адпачываў у кампаніі двух прыяцеляў і дзяўчыны. Адзін з прысутных, які працуе ў IT-кампаніі, прапанаваў замовіць па інтэрнэце партыю «марак», якія дылеры пазіцыняруюць як «легальныя». Спажылі іх усе чацвёра па дарозе на кватэру, дзе праходзіла вечарына. Неўзабаве праграмісту, які купіў псіхатроп, стала дрэнна, і ён у неадэкватным стане выбег на вуліцу. Следам за ім пабеглі і адзін з хлопцаў, і дзяўчына, якія тут жа выклікалі таварышу брыгаду хуткай медыцынскай дапамогі. Калі рачка вярнулася назад, іх 24-гадовы сябар, што застаўся ў кватэры, ужо не падаваў прыкмет жыцця. Як высветлілася, малады чалавек памёр ад перадазіроўкі. Пацярпелы, якому выклікалі «хуткую», зараз знаходзіцца ў РНПЦ псіхічнага здароўя ў Навінках.

Праваахоўнікі нагадваюць, што ў Беларусі няма легальных наркотыкаў і псіхатропаў. А самі «спайсы» ўсё часцей прыводзяць да летальнага зыходу, у лепшым выпадку — да бальнічнага ложка, у тым ліку і ў псіхіятрычнай бальніцы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ 1 сакавіка — Міжнародны дзень барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам

СМЕРЦЬ АД СПАЙСУ

Колькасць хворых на наркаманію ў краіне штогод расце. З 1987 года яна выраслa ў 33 разы. У сталіцы — у 56 разоў. Ужываецца, галоўным чынам, опій, а таксама канабіс, гераін, псіхастымулятары і інш. Летась фактычна штотыдзень з'яўляўся новы наркотык. Атрымлівалася, што да моманту ўключэння яго ў спіс забароненых рэчываў незнаёмы наркотык прадаваўся беспакарана. Каля 50 працэнтаў наркаспажыўцоў маюць сярэднюю адукацыю, 20 працэнтаў — няпоўную сярэднюю. У паловы — судзімасць.

— Акрамя таго, што наркаманія прыводзіць да фізічнай, маральнай і сацыяльнай дэградацыі асобы, яна штурхае людзей, якія страцілі сябе, на злачынствы, — кажа **загадчык сектара наркалогіі РНПЦ псіхічнага здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Уладзімір МАКСІМЧУК.** — Летась зафіксавана звыш 6 тысяч злачынстваў, звязаных з наркотыкамі. Гэта і збыт наркатычных сродкаў, і арганізацыя прытонаў, схіленне да ўжывання наркарэчываў, крадзеж наркотыкаў. Праблема распаўсюджвання наркаманіі займае не апошняе месца і ў ліку прычын высокай смяротнасці, нізкай нараджальнасці, нізкай працягласці жыцця. У Беларусі штогод ад перадазіроўкі наркотыкаў памірае да 100 чалавек...

У апошнія гады «модным» сярод моладзі стала ўжыванне спайсаў — курыльных сумесяў, якія апрацоўваюцца тым ці іншым наркатычным рэчывам. **Ужыванне спайсу прыводзіць літаральна да імгненнага развіцця залежнасці.** Псіхалагічная залежнасць з'яўляецца пасля аднаго-двух разоў ужывання, фізічная — праз 2-3 месяцы. **Летась па дапамогу пасля ўжывання сінтэтычных псіхатропаў, якія ўваходзяць у склад курыльных сумесяў, звярнуліся каля 700 чалавек. 6 чалавек загінулі. З пачатку гэтага года ўжо зафіксавана каля 100 зваротаў і 2 лятальныя зыходы.**

Так, 14 лютага ў пасёлку Прывольны Мінскага раёна кампанія хлопцаў набыла спайс праз інтэрнэт. Эфект уздзеяння на арганізм аднаго са спажыўцоў прывёў да трагедыі. Малады чалавек устаў на падаконнік, разбіў рукамі шклопакет, з-за чаго парэзаў абедзве рукі, шыю, спіну і да прыезду «хуткай дапамогі» загінуў ад страты крыві. 17 лютага ў машыне «хуткай» памёр 9-класнік адной са спартыўных школ Мінска. У бессвядомым стане яго забралі з кватэры жылога шматпавярховага дома ў мікрараёне Серабранка з дыягназам «перадазіроўка наркотыкамі». Смерць наступіла ў выніку ўжывання «сінтэтыкі», набытай праз інтэрнэт.

Наогул, як правіла, падлеткі, які выраслі паспрабаваць наркотык, знаёмяцца з даволі вялікай колькасцю псіхаактыўных рэчываў, што на мове спецыялістаў называецца полінаркатызмам. Паступова фарміруецца перавага ў дачыненні да нейкага аднаго наркотыку. З гэтага моманту ўжыванне становіцца рэгулярным, і чалавек усё жыццё падпарадкоўваецца патрэбе рэгулярнага паўтору інтаксікацыі.

Наркатычная залежнасць больш выражаная ў параўнанні з алкагольнай, хуткі прыводзіць да поўнага спустошвання, канфліктаў у сям'і, на вучобе і працы. Хворыя імкліва дэградуюць. Паколькі паступова ўзрастае патрэба ў павелічэнні дозы, то аднойчы нарказалежны рызыкуе страціць кантроль і загінуць ад перадазіроўкі.

Некаторыя ўскосныя знешнія прыкметы ўжывання наркотыкаў (у наркаманаў са стажам):

- Заўсёды доўгія рукавы адзення. Ненатуральна вузкія або шырокія зрэнкі незалежна ад асвятлення. Неахайны знешні выгляд. Ацёкі рук. Разбураныя зубы. Сутулая постаць. «Расцягнутае» маўленне. Запаволеныя рухі. Раздражнёнасць і рэзкасць пры адказе на пытанні.
- Хуткія, частыя, не адпаведныя сітуацыі змены настрою.
- Сляды ад ін'екцыйнага ўвядзення наркотыкаў — на любых частках цела, не выключаючы скуру галавы. Часта сляды ўколаў зліваюцца ў шчыльныя сінявата-барвовыя плямы па ходзе вен.
- Зніжэнне паспяховасці ў вучобе, прагулы заняткаў. Павелічэнне часу «гуляння».
- Рост фінансавых патрэб — знікненне грошай з бацькоўскіх кашалькоў, каштоўных рэчаў з дома.
- З'яўленне новых «падазроных» сяброў.

Навошта?

Ужыванне наркотыкаў дае эфект стану лёгкага «палёту», галавакружэння, добрага настрою, бяспечнасці, галюцынацый. Матывацыяй можа стаць пасіўнае перайманне паводзін «сяброў», што ўласціва псіхічна няспелым, інфантыльным асобам.

Як вынік...

...пагаршэнне памяці, падаўленне волі, зніжэнне інтэлектуальных здольнасцяў, з'яўленне агрэсіі, цяжкія паражэнні ўнутраных органаў, у тым ліку галаўнога мозга.

Калі абарваць прыём

Сіндром адмены — гэта падаўлены настрой, раздражняльнасць, галаўны боль, сутаргі, пашыраныя зрэнкі, дрыжанне пальцаў, павек, языка, павышаны сухажыльны рэфлекс, рухальнае ўзбуджэнне, непрыемныя адчуванні ва ўсіх частках цела. Сітуацыя можа пагаршацца цягам тыдня, потым паступова пайсці на спад. На больш працяглы час застаюцца бяссонніца, прыступы незадаволенасці, злосці, тугі.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

ОБЪЯВЛЕНИЕ

28 марта 2014 года по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176 (конференц-зал, 4 этаж главного корпуса)
СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОТЧЕТНО-ВЫБОРНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Камволь»

Начало собрания в 10.00.
Регистрация участников собрания с 9.00 до 9.45.

Повестка дня:

1. Отчет о финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2013 году и основных направлениях деятельности Общества на 2014 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2013 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии и заключение по бухгалтерскому балансу, отчет о прибылях и убытках и годовому отчету Общества.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества за 2013 год.
5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2013 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2014 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Маяковского, 176, тел. 223-14-20.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 марта 2014 года.

Для регистрации при себе иметь паспорт. УНП 100074393

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк»
с 03.03.2014 устанавливает процентную ставку по вновь принимаемым срочным банковским вкладам в белорусских рублях:

- **«Приоритет»** – в размере 41% годовых;
- **«Гарантированный доход»**:
  - сроком на 15 дней – в размере 32% годовых;
  - сроком на 35 дней – в размере 40% годовых.

*(По ранее принятым на указанные сроки вкладам **«Гарантированный доход»** установленный размер процентной ставки применяется с даты автоматического перезаключения на новый срок начиная с 03.03.2014)*;

- **«Интернет-депозит-Презент»** – основной доход в размере 40% годовых.
- **«Четыре сезона»** – основной доход в размере 41% годовых.

С 03.03.2014 установлена процентная ставка по вновь оформляемым сберегательным сертификатам со сроком обращения 1 месяц – в размере 40% годовых, 2 месяца – в размере 41% годовых.

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)

Свидетельство о государственной регистрации, печать круглая, штампы ИП БЕЛОГО Вадима Александровича, УНП 491031307 **считать недействительными в связи с утерей.**

■ Увага: віктарына!

СЦЕЖКАМІ РОДНАЙ ПРЫРОДЫ

Шаноўныя чытачы, «Звязда» запрашае вас у прыемнае і цікавае завочнае падарожжа па родным краі. Аб тым, што ў нас — самая прыгожая і багатая прырода, у Беларусі з гонарам скажа кожны школьнік. І гэта — чыстая праўда. Мы яе любім, і сапраўды ганарымся ўнікальнымі роднымі краявідамі, чысцюткімі рэкамі і азёрамі, вялікай колькасцю рэдкіх звяроў, птушак, раслін. Мы стараемся зберагчы гэты скарб, каб і дзеці, і ўнукі мелі з чаго цешыцца, дзе адпачываць душой...

Але ці шмат мы ведаем пра родную прыроду, акрамя таго, што яна надзвычай багатая і што яе трэба ахоўваць? Задумаліся? Мы прапануем праверыць гэта на справе. Вам трэба толькі адказаць на некалькі пытанняў, выбраўшы з прапанаваных варыянтаў адказаў адзін правільны. Адказы прымаюцца на працягу трох тыдняў пасля апублікавання пытанняў. Дасылаць іх можна на паштовы адрас рэдакцыі або на e-mail: pryroda@zviazda.by з пазнакай «віктарына». Першыя тры ўдзельнікі віктарыны, якія дашлюць правільныя адказы, атрымаюць ад рэдакцыі прыгожыя і карысныя сувеніры. А ўдзельнікам, як вы ўжо зразумелі, можа стаць кожны.

Хаця, ведаючы нашых кемлівых і неабыякавых чытачоў, маем усе падставы думаць, што не дзеля прызоў вы будзеце старацца. Бо «любіць» па-нашаму — гэта яшчэ і «ведаць», і «разумець», праўда? Далучайцеся — падарожжа па сцежках роднай прыроды будзе цікавым. (Забягаючы наперад, скажам: вандроўка абяцае быць з працягам!)

1 Папуляцыю якіх дзікіх коней аднаўляюць цяпер у Белавежскай пушчы?
- Конь Пржавальскага
- Мустанг
- Тарпан
- Дрыкгант

2 Як называецца птушка на фота?

- Сава звычайная
- Вераб'іны сыч
- Савіны верабей
- Пугач

3 Самцоў якіх птушак называюць «джэнтльменамі» за тое, што яны лепшы корм заўсёды пакідаюць самкам?
- Буслоў
- Снегіроў
- Сініц
- Ястрабаў

4 Як зязюлі ўдаецца падкладваць у гнёзды іншых птушак свае яйкі?
- Яна робіць гэта тады, калі гаспадары гнязда спяць
- Яна адганяе гаспадароў сваім грозным «ку-ку»
- Яна выдзяляе непрыемны пах, і птушкі злятаюць з гнязда
- Яна афарбоўкай пер'я падобная на ястраба, і пры яе набліжэнні птушкі ўцякаюць

5 У студзені 1936 года ў адным з беларускіх гарадоў быў зафіксаваны «туманны» рэкорд — 247 гадзін. Дзе назіраліся такія частыя туманы?
- У Пінску
- У Полацку
- У Магілёве
- У Рэчыцы

6 Які від шыпшыны, што расце ў Беларусі, змяшчае ў пладах найбольш вітаміну С?
- Шыпшына майская
- Шыпшына сабачая
- Шыпшына Вудса
- Шыпшына Марэ

7 Якога колеру зубы ў баброў?
- Белыя
- Жоўтыя
- Карычневыя
- Аранжавыя

ВАЖНАЯ ПАДКАЗКА

Знайсці адказы на гэтыя пытанні вам будзе нашмат прасцей (ці, мабыць, нават вельмі проста), калі вы пагартаеце першы нумар за 2014 год часопіса «Родная прырода» — новага цікавага праекта Выдавецкага дома «Звязда». Акрамя таго, што даведаецеся шмат новага і цікавага, зможаце правільна адказаць на ўсе пытанні віктарыны, вы атрымаеце сапраўднае задавальненне ад унікальных фотаздымкаў звяроў, птушак, раслін, проста родных краявідаў, бо часопіс небеспадстаўна лічыцца найлепшым ілюстраваным выданнем аб прыродзе.

Каб пераканацца ў гэтым — варта паспяшацца на пошце ўмовамі падпіскі на другі квартал, бо «Родная прырода» ў розніцу прадаецца, але доўга ў шапіках не залежваецца. А часопіс вам вельмі спатрэбіцца ў нашай інтэлектуальна-краязнаўчай вандроўцы сцежкамі роднай прыроды.

«НОВАЯ ЗЯМЛЯ» ЗАГУЧАЛА ПА-НОВАМУ

Літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа парадаваў прыхільнікаў творчасці песняра прэзентацыяй новага выдання яго славутай паэмы «Новая зямля». Незвычайнасць выдання ў тым, што яно стала сімвалам 90-годдзя паэмы з часу яе першага выхаду ў свет (1923 год). І яшчэ тым, што кніга ілюстравана рукою нашага славутага сучасніка, народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча. Амаль сто малюнкаў — краявіды, партрэты, сцэны сялянскага побыту і з жыцця шляхты — стварылі непаўторны мастацкі вобраз паэмы, значна ўзбагацілі гэты твор.

Пра незвычайнае суаўтарства двух выбітных творцаў, пра выбар тэмы мастаком і яго любоў да Беларусі ўзрушана казалі многія ўдзельнікі сустрэчы з Васілём Пятровічам, якому зусім нядаўна споўнілася 75 гадоў. На вечарыну былі запрошаны ўкладальнік кнігі гісторык і пісьменнік Адам Мальдзіс, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар Шніп, старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп, пісьменнік Анатоль Бутэвіч, народная артыстка Беларусі, зямлячка мастака Марыя Захарэвіч. Красамоўна і натхнёна чытаў урыўкі з паэмы малодшы сын Якуба Коласа Міхась Міцкевіч.

- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.
Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
Копии документов представляются без нотариального засвидетельствования.
Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.
В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол о результатах аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона, отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин.

Телефон для справок: (8-017) 213-28-18, факс (8-017) 207-84-66.

Извещения о проведенных ранее аукционах были опубликованы в газете «Звязда» 06.09.13 по Лоту № 1, 05.06.13 по Лотам № 2, № 3, № 4, 19.11.13 по Лоту № 5, 27.08.13 по Лотам № 6, № 7.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 5 (222)

■ Дзеля памяці

АД РАДАВОДУ ДА ТАЯМНІЦ ВЕРШАСКЛАДАННЯ

Серыя «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» распавядае пра Аркадзя Куляшова

Да 100-годдзя народнага паэта Беларусі выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусціла кнігу «Лясному рэху праўду раскажу». Аўтар — Валянціна Куляшова — распавядае пра свайго бацьку. Акрамя таго што дзякуючы выданню ёсць магчымасць больш даведацца пра жыццёвы і творчы шлях паэта, які нарадзіўся ў вёсцы Сматрэвічы Магілёўскай вобласці, чытачы становяцца бліжэй да яго творчасці: у кнізе змяшчаюцца вершы і ўрыўкі паэм Куляшова. Але ці не найбольш каштоўнае ў такіх выданняў — спроба паглядзець на класікаў і вядомых творцаў менавіта як на людзей, якія ў свеце стасуюцца з іншымі, кахаюць, сябруюць, перажываюць, дзеляцца з некім пачуццямі, эмоцыямі і часцінкай душы.

Кніга, прысвечаная Аркадзю Куляшову, стала 17-м выданнем у серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі». Раней былі прадстаўленыя выданні пра класікаў айчыннай літаратуры — такіх, як Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Іван Шамякін, Максім Танк. Прэзентацыя кнігі «Лясному рэху праўду раскажу» адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, якая да юбілею А. Куляшова прадставіла выставу з яго збораў розных гадоў выдання, яго твораў у перакладзе на розныя мовы свету, манаграфій пра жыццё і творчасць паэта.

Ларыса ЦІМОШЫК

■

■ Кінакрокі

«Туфлікі» прывялі да гісторыі з сабакам

Добра вядомы чытачам «Звязды» кароткаметражны фільм пра халакост «Туфлікі», зняты пры ўдзеле 5 краін, у тым ліку і Беларусі, неўзабаве займее працяг. Ім стане фільм «Брут» (другая частка трылогіі «Сведкі» памяці ахвяр халакосту) — гісторыя паводле апавядання чэшска-нямецкага пісьменніка Людвіга Ашкеназі, якая распавядае пра тое, як вайна, расавыя законы і чалавечая жорсткасць разлучылі нямецкую аўчарку па мянушцы Брут са сваёй гаспадыняй. Сабака патрапіў у канцлагер, дзе яго зрабілі вартавым. У выніку бяскрыўдны хатні сабака ператварыўся ў злоснага звера-забойцу.

Прадзюсар фільма Юрый Ігруша распавёў, што сабак для фільма будуць выбіраць у беларускіх пітомніках. Гэта будуць сабакі рознага ўзросту: ад шчанюка да дарослага звера.

Мяркуецца, што рэжысёрам карціны «Брут», як і «Туфлікаў», стане расійскі кінарэжысёр Канстанцін Фам. Наогул над стужкай будуць працаваць спецыялісты з Беларусі, Расіі, Ізраіля і ЗША. А здымкі пройдуць на тэрыторыі Беларусі і Чэхіі. Вядуцца перамовы пра здымкі на тэрыторыі канцлагера Тэрэзін.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ

■

■ Кніжная паліца

ПАКЛОН

Лепей — па-беларуску!

Напрыканцы мінулага года ў літаратурным свеце краіны адбылася падзея пад назвай «Лепей». Аўтар незвычайнага зборніка рукапісаў (якія пазначаны 1952–2013 гадамі) — народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін. Адметнае выданне не проста прадстаўляе вершы паэта: ёсць магчымасць пабачыць, як клапатліва выпісаны літары яго ўласнай рукой. Выпісаны з любоўю да сэнсаў, якія гэтыя літары ўтвараюць, калі збіраюцца ў словы. І адчуваецца, што словы пражытыя, прачулыя, балючыя і радасныя, дадзеныя Звыш. І гэтыя словы — нашы, пра нас. Прыгожа — і па-беларуску. Здавалася, лепей за Барадуліна паказаць іх прыгажосць і багацце складана. Але ўсё ж — можна.

І гэта паказаў ён жа. Гаворка пра яшчэ адну кнігу 2013 года, якая называецца «Вушацкі словазбор Рыгора Барадуліна». І тут складана не пагадзіцца з тым, што гэта «Цуд!» Таму што кніга пра словы. Пра тыя словы, якія зрабілі хлопчыка з Вушаччыны паэтам. Безумоўна, каб пісаць вершы, патрэбны талент. Безумоўна, каб размаўляць праз вершы з людзьмі, трэба мець што сказаць. Але не можа быць паэта без мовы, якою ён прамаўляе, не можа быць паэта без выдатнага валодання словам, без слоўнага багацця, трапнасці, адмысловасці, смаку. І калі пачынаеш смакаваць беларускія словы ўслед за Рыгорам Іванавічам, то ўзнікае пачуццё напоўненасці: у такія моманты хутчэй за ўсё даходзіць сэнс выразу «ежа духоўная». І радуешся жыццю, якое праходзіць сярод такога багацця. Ды вось жа шкада, што збіраць гэтае багацце, дадзенае мільёнам беларусаў, здагадваюцца адзінкі.

У кнізе сабраны словы і выразы таго кутка беларускай зямлі, які стаў моўнай крыніцай паэта. Кніга мае прысвячэнне: «Светлае памяці мамы Куліны». Барадулін прызнаецца, што для яго гэтая кніга — сустрэча з блізкімі. Але і развітанне. «Гэта мой паклон да зямлі тым, хто пялегваў праз вякі нашае самабытнае слова».

Паклон — ад паэта. І паклон яму: быў люты — месяц Барадуліна. І гэта той час, калі, можа быць, ён разважае пра сваё нараджэнне, пра сваё выхаванне сярод народа, які даў магчымасць жыць, і жыць асэнсавана. Таго народа, ад якога ўзяў галоўнае — мову, праз якую праявіў свой талент.

А цяпер сапраўды, колькі жывога сыходзіць разам з носьбітамі мовы, і часам, імкнучыся гаварыць «правільна», «граматна», «цывільна», нават літаратурна па-беларуску, мы губляем і наогул страчваем каларыт мясцін, з якіх паходзім. А ў кожнай з іх — свой слоўны смак, які прыходзіць заўсёды праз тых, хто з мовай жыве і не імкнецца падстройвацца пад іншыя варыянты гаворак. У гэтым жа і багацце Беларусі: што ні мясцовасць, то свае слоўцы. Свае прымаўкі. Свая мудрасць. Людзі, якія цэняць і паважаюць сябе (нават простыя людзі), гэтую мудрасць не проста прамаўляюць у залежнасці ад сітуацыі — яны ёю карыстаюцца ў жыцці. Ці не на кожную жыццёвую складанасць (ці, наадварот, радасць) у беларусаў ёсць свае крылатыя выразы, прыказкі ды прымаўкі. Мудрасць Барадуліна як творцы ў тым, што ён захаваў гэтую вушацкую адмыСЛОВАсць у паэзіі. Мудрасць яго як чалавека ў тым, што занатоўваў і тым самым зберагаў моўнае багацце свайго краю. Натуральна, хочацца знайсці тлумачэнне, што і чаму пабуджае да гэтага. І аўтар тлумачыць: «Мама перадала мне найвялікшы дар — мову нашую крывіцкую з вушацкай падсветкай, з вушацкім прысмакам. Мова Вушаччыны сягае ад паганскіх каранёў і да біблейскага неба… Вушацкі словазбор — спроба сабраць за адным бяседным сталом хоць крышачку непераўзыдзенага шматгалосся роднае мне зямлі, шматгалосся, якое, на жаль, пачынае глухнуць».

Аднак усё залежыць выключна ад людзей. Ад іх любові ці абыякавасці. Ад іх адданасці і адарванасці. Ад той повязі са спрадвечным і існым, якая існуе нават тады, калі ты ўжо выйшаў на іншы ўзровень адукацыі і развіцця (ну, нібыта…) І ўзяўшы ў рукі гэтую кнігу, я падумала пра тое, як мне падабаецца слухаць гаворку свайго раёна, насамрэч такую цёплую, хоць некаторым паляшуцкі дыялект падаецца грубаватым. Але, калі гавораць мае бацькі — гэта ж музыка, з пераліваміі, асобным рытмам, у якой (мне так здаецца!) зашыфраваны код усяго сусвету (паспрабуйце даказаць адваротнае). І як тут не пагадзіцца з паэтам: усё пачынаецца ад бацькоў. І нават калі адрываешся ад іх і жывеш сваім розумам, усё роўна ўнутры застаецца іх сутнасць, а іх словы ўспыхваюць зоркамі ў галаве, рвуцца вонкі ў тыя моманты, калі інакш і лепей не скажаш. Але што неверагодна радуе ў Беларусі: раз-пораз у гутарках хтосьці можа заўважыць: «А ў нас кажуць інакш…» Радуе, што, аказваецца, не такая ўжо маленькая наша краіна, калі столькі варыянтаў, столькі магчымасцяў выказацца і данесці думку. І якая ж багатая на словы! Можа, таму і багатая на цудоўных паэтаў, кожны з якіх праз словы ўслаўляе ў вечнасці сваю малую радзіму. У прадмове да «Вушацкага словазбору Рыгора Барадуліна» ёсць прызнанне аднаго з іх: «Я проста купаўся ў чысцюткай, як вушацкае возера Вечалле, беларускай мове, чытаючы рукапіс гэтай кнігі. Колькі слоў, ані ў якіх слоўніках не зафіксаваных. Якое мы да таго, што ёсць, яшчэ багацце маем!»

Гэтае багацце ўвасоблена ў некалькіх раздзелах кнігі, дзе ёсць уласна слоўнік, устойлівыя выразы, прыказкі і прымаўкі, параўнанні, зычэнні, загадкі, дзіцячыя гульні, стравы, народны каляндар, жыццёвыя назіранні, увасобленыя ў словах… І вось жа занатоўваў паэт усё, а з'явіўся чалавек, дзякуючы якому стала магчыма гэта ўсё зберагчы ў выглядзе кнігі, — аўтар ідэі і ўкладальнік Наталля Давыдзенка. І шмат што, аказваецца, на Вушаччыне, гучыць гэтак жа, як і ў нас на Палессі, і мае тое ж значэнне: як, напрыклад, выразы «вытлуміць мазгі» ці «лынды біць». І не трэба тлумачыць, здаецца, нікому ў Беларусі, што значыць «свая хатка як родная матка». Але ж калі засвойваю вушацкія словы, то мысленна шукаю «свой», паляшуцкі варыянт…

Ларыса ЦІМОШЫК

■

Са слоўніка:

Абзыў — вясціна, водгук. *Ад яго й абзыву няма.*
Белле — святочная апратка.
Вельмаваць — прывячаць, частаваць.
Гамолка — акраец, луста, скібка.
Дабрына — збажына.
Еменка — бульба на спажытак. Еменка на емя, а семенка на семя.
Жаўжаняткі — малыя жвавыя дзеткі.
Задрыга — нягеглы.
Ісподкі — вязаныя рукавіцы.
Кавёлы — ногі.
Любосць — каханне, мілосць.
Мазгаўня — галава.
Наські — тутэйшы, свой.
Пекліцца — мучацца, цяжка працаваць.
Руя — гайня, чарада. *Руя ваўчыная спакою ня маіць.*
Ссачок — жакет.
Тубан — натоўп, юрма.
Убоіна — упарты, непаваротлівы, ленаваты. *Такая ўжо ўбоіна, хоць крычы, хоць маўчы.*
Фасунак — клад, скарб.
Хвась — гонар, ганарлівасць.
Цяпельца — вогнішча.
Чмур — балагур, зух пагаварыць, вясёлы. *З гэным чмуром са смеху памром.*
Шаргункі — бомы, званочкі.
Юр — жарсць, пал.
Ясачка — блісцінка, іскрынка.

■ З першых вуснаў

ПА-НАД ЭПОХАМІ

ПАСТАНОЎШЧЫК «РЫГАЛЕТА» РАЗВАЖАЕ ПРА АКТУАЛІЗАЦЫЮ ОПЕРНАЙ КЛАСІКІ

Нееме Кунінгас — вядомы эстонскі рэжысёр, пастаноўшчык оперы Вердзі «Рыгалета» ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры, прэм'ера якой адбываецца ў першыя дні сакавіка. Ён працуе ў эстонскай оперы больш як 20 гадоў, прычым 15 з іх — музычным кіраўніком тэатра. Сёння Нееме ставіць спектаклі ў розных краінах. У мінулым сезоне падчас гастроляў эстонскага тэатра мінскія аматары опернага мастацтва мелі магчымасць пачуць яго «Травіяту». У рэпертуары эстонскага тэатра ёсць і опера «Рыгалета» ў яго пастаноўцы. Гэтая рэжысёрская канцэпцыя будзе прадстаўлена і ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Напярэдадні прэм'еры Нееме Кунінгас разважае пра сваё стаўленне да Мінска, беларускага тэатра і опернага мастацтва.

Пра Мінск

— У 1970-я гады праходзілі гастролі тэатра оперы і балета «Эстонія» ў Мінску, а я быў маладым артыстам хору. Мы прыехалі на цягніку, які называўся «Чайка». Пасялілі нас у гасцініцу «Мінск». Пачалі рэпеціраваць. І раптам нам сказалі, што гастролі адкладваюцца на тыдзень, таму што сам Леанід Брэжнеў прыязджае ў Мінск уручаць Мінску зорку з нагоды прысваення сталіцы БССР звання «Горад-герой». Было лета, вельмі хораша, але спякотна. Цэлы тыдзень мы гулялі, глядзелі, як рыхтавалі і ўпрыгожвалі горад. Гастролі адбыліся пасля ад'езду Брэжнева.

А цяпер зусім іншы час, зусім іншыя абставіны, і я ўжо не харыст, а рэжысёр. Летась прыязджаў у Мінск некалькі разоў з нагоды нашай сёлетняй пастаноўкі. Летась у жніўні я гуляў па горадзе гэтак жа, як і шмат гадоў таму, пазнаў гасцініцу «Мінск» і нават адчуў настальгію па тым часе, калі быў зусім маладым. У мяне ёсць фотаздымак тых гадоў — на фоне нейкага мінскага фантана я стаю ў шырокіх штанах і з доўгімі валасамі.

Маё ўспрыманне вашага горада вельмі асабістае і, напэўна, суб'ектыўнае. Мінск і тады, і цяпер мне здаецца «гарызантальным»: тут шмат паветра, прасторы. Я бачу ў гэтым нейкі арыстакратызм. Гэта не камплімент, а маё ўспрыманне. Бо рэжысёр заўсёды думае вобразна — нейкімі асацыяцыямі, метафарамі. Часам гэта дапамагае, а бывае, і вельмі перашкаджае. Хтосьці з вялікіх пісаў, што ў людзей, якія нарадзіліся, выраслі і прывыклі жыць у вялікіх памяшканнях, прывыклі да вялікай прасторы, вочы факусіруюцца інакш, чым у тых, хто прывык да цеснаты. Мінск, з яго гарадскімі ландшафтамі, шырокімі дарогамі, дае магчымасць так бачыць.

Нееме Кунінгас (справа) падчас рэпетыцыі.

Пра настаўнікаў

— Мне было 17, калі я пачаў вучобу ў Талінскай кансерваторыі на аддзяленні вакалу. Прычым не хацеў быць «сярэднім» або проста добрым — я хацеў быць вельмі добрым спеваком. Пакуль вучыўся, выканаў даволі шмат роляў, асабліва ў лёгкім рэпертуары — мюзіклах, аперэце. На другім курсе пачаў спяваць у тэатральным хоры эстонскай оперы. Вясной 1979 года я атрымаў дыплом опернага спевака, а ў верасні ўжо быў студэнтам першага курса маскоўскага ГИТИСа.

Афіцыйна я адпрацаваў адзін месяц па размеркаванні — салістам дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Эстоніі. Якраз тады Георгій Ансімаў ставіў у нас оперу «Заручыны ў кляштары» Сяргея Пракоф'ева. Мяне прызначылі яго асістэнтам. Пасля прэм'еры Ансімаў сказаў, што бярэ мяне на свой курс у ГИТИС, калі я гатовы паехаць у Маскву на 5 гадоў. Гэта быў вялікі выклік — Масква. І я пагадзіўся. У мяне былі цудоўныя педагогі: сам Георгій Ансімаў, а таксама Барыс Пакроўскі, Яўген Акулаў. Пяць гадоў я там вучыўся, а потым вярнуўся ў эстонскі тэатр у якасці рэжысёра — спачатку быў чарговым, а потым галоўным.

Пра оперу

— Ці на пад'ёме сёння опернае мастацтва? У гісторыі оперы былі і ўзлёты, і няпростыя часы… Пасля стагоддзяў поспеху, у першай палове XX стагоддзя развіццё оперных формаў «пачало тармазіць». Тады ж на хвалі авангарду з'явілася новая музычная мова, якая, аднак, была не вельмі добрай для опернага мастацтва: у творах практычна адсутнічала мелодыя, прысутнічала какафонія. Новых якасных опер не ўзнікала. Таму ў сярэдзіне XX стагоддзя оперныя тэатры вярнуліся да «старога золата». Па-ранейшаму заставаўся культ дырыжораў і вакалістаў.

У 1960–1970-я гады на піку моды былі мегамюзіклы — яркія, меладычныя, з добрым сюжэтам, эфектна аформленыя. Яны «перацягнулі» маладую тэатральную публіку, якая цікавіцца музычным тэатрам. Лаяльным да опернага мастацтва засталося старэйшае пакаленне тэатралаў. Аднак умоўнасць на опернай сцэне, усё бутафорска-фальшывае стала кідацца ў вочы. Крытыкі пачалі гаварыць пра заняпад оперы, пра тое, што старое мастацтва ўжо «нікуды не прыдатнае». Таму оперныя тэатры прыняліся шукаць новы рэпертуар, вынаходзіць новыя формы і канцэпцыі для пастаноўкі класікі — з'явілася тэндэнцыя мяняць у оперных спектаклях эпоху, форму. Сапраўднае наватарства ў форме з'явілася ў 1980-я гады ў Германіі, Англіі, а ў нас — яшчэ пазней. Пачаўся культ рэжысёраў.

Але сёння, у 2014 годзе, мы зноў гаворым пра крызіс у оперы. Аднак цяпер ён заключаецца ў іншым. Гэта крызіс опернай эстэтыкі. Так званае «наватарства» сёння — гэта часта проста трукі, сенсацыя, імкненне любымі спосабамі зрабіць так, як раней ніхто не рабіў. Актуалізаваная класіка працуе, калі ўсё, што адбываецца на сцэне, матывавана. Я бачыў некалькі такіх спектакляў — напрыклад, «Дон Жуана» Моцарта ў пастаноўцы Пітэра Селерса. Ён перанёс дзеянне ў нефешэнебельныя кварталы Нью-Ёрка. Яшчэ ў 1982 годзе Джонатан Мілер паставіў «Рыгалета» Вердзі ў Англійскай нацыянальнай оперы і перанёс дзеянне ў 1950-я, ператварыўшы герцага ў боса мафіі. Мне вельмі спадабаўся «Лятучы Галандзец», які я бачыў у Нацыянальнай оперы Уэльса ў Англіі з Браянам Тэрфелам у галоўнай ролі. Гэта было зроблена ў стылі starwars — цікавае, касмічнае відовішча. Я таксама паставіў нямала актуалізаваных спектакляў. Дарэчы, «Аіду» ў Фінляндыі таксама калісьці рабіў з пераносам часу: дзеянне там адбывалася на касмічным караблі Egypt у далёкай будучыні…

Пра «Рыгалета»

— Рабіць гэты спектакль у той эпосе, у якой прыдумляў кампазітар, я лічу, самы сумленны падыход. Гісторыя інтэрпрэтацыі оперы «Рыгалета» настолькі доўгая, так многа разоў да яе звярталіся… Мянялі эпоху, рабілі спектаклі — то пахабны, то дзіўны, то незразумелы. Але сённяшняга гледача здзівіць такім прачытаннем складана, таму што ў кіно, на тэлебачанні хапае парадных сюжэтаў, і пры гэтым дыстанцыя, гістарычная або часавая, нашмат карацейшая. А не мяняючы эпоху, зрабіць актуальна — гэта складаней. Пры гэтым важны эфект псіхалагічны. Пажадана, каб глядач пазнаў сітуацыі, пачуцці, эмоцыі, канфлікты, якія для людзей і сёння актуальныя. Мы правакуем нейкія асацыяцыі, якія ўзбуджаюць у гледача неабыякавага цікаўнасць, ён становіцца суаўтарам нашага спектакля. Але як рэжысёр я не хачу паказваць пальцам: маўляў, вось у гэтым мараль! Гэта не вельмі сціпла.

Ёсць імпульсы ў гэтай музыкі, у гэтых вобразах, якія і ў нашы дні мы можам трактаваць, інтэрпрэтаваць цікава, можа, нават больш цікава, чым у вердзіеўскія часы. У вобразе Рыгалета для мяне важна паказаць, што ён — не фізічны вырадак, не інвалід. Мне не хочацца, каб публіка спачувала яму таму, што ён інвалід. Для мяне гэта перш за ўсё чалавек з хворай свядомасцю. Для яго служба ў Герцага — гэта, у першую чаргу, праца. Ён апранае рабочае адзенне, ходзіць на працу, весяліць Герцага, здзекуецца з прыдворных. Мне здаецца, што менавіта такую канцэпцыю, можа, падсвядома, задумваў сам Вердзі.

Пра выканаўцаў

— У тэатр сёння прыйшло цалкам новае пакаленне вакалістаў. Яны таленавітыя. Акрамя таго, што ў сваім тэатры выконваюць ролі, імкнуцца бачыць свет, выступаць у іншых трупах, пашыраць свой далягляд. Гэтыя якасці і прафесіяналізм маладыя выканаўцы прыносяць і на сцэну свайго тэатра. Тое ж самае магу сказаць і пра беларускіх спевакоў. Яшчэ да працы ў беларускім тэатры над «Рыгалета» я пазнаёміўся з Ільёй Сільчуковым, які спяваў Жэрмона ў «Травіяце» ў нас у эстонскім тэатры. Часу на падрыхтоўку было мала, таму я ўвёў яго ў мой спектакль з асцярогай. Але, як высветлілася, акрамя таго, што ён мае прыгожы голас, малады чалавек хутка думае, валодае мовамі, адразу разумее ўсе рэжысёрскія патрабаванні і ўмомант усё робіць. У мінскім тэатры падчас працы над «Рыгалета» адкрыў для сябе Уладзіміра Пятрова, Уладзіміра Громава, Станіслава Трыфанава. Вельмі розныя і па вопыце, і па характары, усе яны — выканаўцы вельмі высокага ўзроўню. Проста Rolls-Royce! Цікавыя спявачкі Дзіяна Трыфанава і Таццяна Гаўрылава. Прыемна працаваць з такімі людзьмі.

Пра цуд

— Феномен оперы, балета і ўвогуле тэатра ў тым, што яны моцна адрозніваюцца ад усяго таго, што кожны дзень нас акружае (інтэрнэт, кіно і г. д.). У адрозненне ад нейкіх праграм, перадач або фільмаў, якія я магу паглядзець потым, у любы час, музычны тэатр — гэта храм, у які прыходзяць людзі ўбачыць цырымонію. Колькі гледачоў у зале, столькі будзе розных спектакляў у гэты вечар, бо кожны ўспрымае па-свойму. Ці гэта не цуд?..

Вольга САВІЦКАЯ

■

■ Выстава

ДЫЯЛОГ

МАСТАЦТВА, ЯКОЕ ВУЧЫЦЬ СЛУХАЦЬ, БАЧЫЦЬ І ГАВАРЫЦЬ

Як быццам трапляеш у казку, у нейкую гісторыю з беларускай міфалогіі або ў прыпавесць з непазнавальнымі рэквізітамі, але вельмі пазнавальным зместам. Або ў казку «Аліса ў краіне цудаў», калі б гэтымі цудамі былі скульптуры. У сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва да 7 сакавіка працуе выстава станковай графікі Валерыя Славука і кабінетнай скульптуры Мікалая Байрачнага. Гэта не проста магчымасць для гледачоў паразважаць і паразмаўляць з мастацтвам, але і сапраўдны дыялог двух вядомых беларускіх творцаў.

Крыху пра Славука

Дарэчы, у Валерыя Славука якраз ёсць малюнак, скрупулёзна напісаны тушшу, які так і называецца — «Дыялог». На ім па два бакі са сваімі гаспадарамі сядзяць каты і сабакі. Яны ўтвараюць як бы два (па прыродзе сваёй канцэптуальна непрымірэнчыя, але вонкава даволі дружалюбныя) лагеры. Валерый Пятровіч расказаў адну цікавую гісторыю, і стала адразу зразумела, адкуль узялася гэтая дружалюбнасць паміж катамі ды сабакамі:

— Ідэя гэтага твора з'явілася ў мяне яшчэ калі я працаваў у старой майстэрні і маім суседам быў Валодзя Вішнеўскі. Мы з ім сябравалі і шмат размаўлялі. У яго быў кот, а ў мяне — сабака, які пражыў 12 гадоў. Так і з'явілася ідэя зрабіць такі малюнак, дзе два чалавекі ў атачэнні катоў ды сабак сядзяць і размаўляюць. Ідзе дыялог. Сабак, дарэчы, на малюнку, 12. Я заўжды стараюся ствараць сваю гісторыю, але хачу, каб глядач бачыў сваю.

Вось я і падумала, што калі адасобіцца ад біяграфічнай гісторыі мастака, то карціна набывае нейкі прыпавесцевы сэнс, становіцца мастацкім філасофскім абагульненнем пра тое, што дыялог — гэта, безумоўна, вельмі добра. Гэта, несумненна, самы лепшы шлях для вырашэння праблем і наогул. Але ён, гэты шлях, можа быць бясконцым, прыемным альбо не вельмі, радасным або маркотным. Дыялог — гэта паняцце метафізічнае. Вельмі цікава, як абсалютна простымі мастацкімі сродкамі пры дапамозе рэалістычнага манахромнага малюнка можна закрануць такія глыбокія пытанні.

Графік Валерый Славук закранае вельмі шмат падобных пытанняў. На выставе прадстаўлена больш за 30 яго твораў: з 1980-х гадоў і да 2012-га. Гэта самая вялікая прэзентацыя твораў беларускага графіка за апошнія гады. Рэтраспектыва, дзякуючы якой можна прасачыць, не толькі як тэматычна і стылістычна развівалася творчасць мастака, але і што адбывалася ў нашай краіне. Так, у 1980-я і 1990-я гады Славук, які скончыў Акадэмію мастацтва ў 1977-м, актыўна распрацоўваў тэму міфалогіі, фантасмагорыі і нават фантастыкі. Тады з'явіліся творы «Паядынак», «Пераможца», «На дрэвах», «Гнёзды», «Дрэва для вогнішча». Але, бадай, самай адметнай з іх падаецца афорт «Шлях», датаваны, што вельмі паказальна, 1991 годам. На малюнку старыя і нямоглыя людзі некуды брыдуць. А вакол — засохлыя дрэвы з драпежнымі птушкамі ды кажанамі. Вельмі сімвалічны вобраз для часоў, калі Беларусь рухалася наперад да незалежнасці, але нават не ўяўляла, што гэта і куды ісці. Як правіла, усе графічныя аркушы тых часоў — друкаваная графіка: афорт, акватынта, шаўкаграфія.

Афорт Валерыя Славука (2001).



Творы Славука, прадстаўленыя на выставе і датаваныя 2000-мі гадамі, — гэта ўжо крыху іншая эстэтыка. Больш прыроды, сімвалізму і метафарызму. Акурат да гэтага перыяду адносіцца і «Дыялог», і іншыя малюнкі: «Раніца», нізка «Псеўдазаалогія», «Дзіцячы сад», «Восеньскі сон», «Маленькія снежныя людзі», «Адпачынак», «Рыбная лоўля». Валерый Славук — майстар ствараць забаўных, камічных, мілых і пачварных істот. А яшчэ ён майстар дэталёвай прамалёўкі. Напэўна, гэтую стараннасць і любоў да дэталяў і заўважыў Васіль Шаранговіч, калі прымаў Славука (тады самавучку без спецыяльнай падрыхтоўчай адукацыі) на вучобу ў тагачасны тэатральна-мастацкі інстытут. Сёння Валерый Пятровіч сам вядомы кніжны графік і таксама выкладае ў Акадэміі мастацтваў. Хіба што калі ён паступаў, конкурс на спецыяльнасць «кніжная графіка» быў 7–8 чалавек на месца, а цяпер — добра калі 1–2…



Скульптура Мікалая Байрачнага.

Яшчэ пра Байрачнага

Непераўзыдзеным майстрам дэталяў з'яўляецца і Мікалай Байрачны, кабінетная скульптура якога таксама прадстаўлена ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва. Скульптар скончыў тэатральна-мастацкі інстытут у 1976 годзе і добра сябруе з Валерыем Славуком. Раззнаёміліся яны, як гэта часта тады бывала, «на бульбе».

— Мастакоў ніколі асабліва не ганялі на бульбу. Але вось курсе на другім нас туды ўсё-такі адправілі, — распавядае Валерый СЛАВУК. — Там мы з Колем і пазнаёміліся. І нават так атрымалася, што старшыня калгаса прызначыў нас разам афармляць мясцовы клуб.

На выставе прадстаўлены невялікія кабінетныя скульптуры Мікалая Байрачнага. Гэта той яшчэ казачны свет! Мне падалося, што аздабляць такімі скульптурамі свае кабінеты павінны перадусім пісьменнікі, асабліва — дзіцячыя. Бо гэта неверагодна прапрацаваныя, ахайныя і прывабныя скульптурныя стварэнні ў выглядзе звяроў. Але не проста звяроў. Усе яны маюць свой настрой і характар. Крумкач трымае гадзіннік у дзюбе. Ён хоць і не зязюля, але таксама адлічвае час. Часта крумкачы лётаюць над могілкамі… Гэта для страшнай казкі. А для добрай — прыветлівае мышаня. Яно таксама з гадзіннікам, але трымае яшчэ відэлец ды ножык. Час абедаць. Як тут не прыгадаць «Алісу» Льюіса Кэрала? А вось жабяня побач з залацістымі кветкамі і нажом у похвах. Гэта для пісьменніка, які піша пра разбойнікаў, бедных ды багатых. Ёсць і пірат з шабляй ды каштоўнасцямі. Во ўжо ў кампаніі каго пісаць пра прыгоды ды падарожжы на караблі ў далёкія краіны! Хоць выстава прысвечана скульптуры Мікалая Байрачнага, сам творца таксама мае непасрэднае дачыненне да літаратуры: ён ілюструе кнігі. Байрачны, як і Славук, акурат з таго пакалення беларускіх мастакоў, на чыю маладосць прыйшліся часы, калі беларуская кніжная графіка квітнела і развівалася найбольш актыўна. Хто не памятае цудоўнай кнігі пра Томаса Соера выдавецтва «Юнацтва» з ілюстрацыямі Байрачнага! Не ведаю, як для каго, а для мяне вясёлы вобраз хлопчыка з вяснушкамі ў выкананні беларускага графіка стаўся найбольш запамінальным, а таму і шчымлівым. А ўся выстава выдатных беларускіх мастакоў, якія маюць шматлікія ўзнагароды і добра вядомыя ў міжнароднай арт-супольнасці, прымушае разглядаць, узгадваць і фантазіраваць.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ

■

■ Перадсвяточнае

САМЫ ЧАРОЎНЫ ДЗЕНЬ

Як толькі надыходзяць першыя вясеннія дзянькі, мужчыны пачынаюць даставаць свае «заначкі» і траціць іх самым бесталковым чынам — на парфуму, біжутэрыю, розныя дробязі для жонак, матуль, каляжанак і г. д.

І няхай трацяць, не перашкаджайце! Таму што 8 Сакавіка — той чароўны дзень, калі нават кактус, падараны нам мужчынамі, можа сысці за шыкоўную ружу. Калі мы рады, што нам хлусяць і ліслівяць, хоць пры гэтым робім выгляд, што прымаем усё за чыстую праўду (жанчыны ж створаны для таго, каб ім гаварылі камплімenты, насілі іх на руках, здзімалі з іх парушынкі). Каб — хоць раз на год! — адчуць сябе слабай і безабароннай, бо, як на тое, амаль кожны дзень «то коні скачуць, то хаты гараць». Таму, мужчыны, ліслівуце! Ліслівасці шмат не бывае. Асабліва 8 Сакавіка.

Дарэчы, нават за гэтае свята — 157 гадоў таму — нам давялося ісці на барыкады! Ніхто не паднёс нам яго проста так, за прыгожа падведзеныя вочкі, на сподачку з блакітным рубчыкам. 8 сакавіка 1857-га тэкстыльшчыцы Нью-Ёрка прайшлі маршам «пустых катрюль» па Манхэтэне, патрабуючы павышэння заробку, паляпшэння ўмоў працы і роўных правоў з мужчынамі. Дэманстрантак, вядома ж, разагналі. Але дзякуй вам, храбрыя жанчыны пазамінулага стагоддзя!

З той пары мужчыны (відавочна, баючыся паўтору каструльнага бунту) цяпер кожнае 8 сакавіка з самай раніцы ўлагоджваюць нас падарункамі, букетамі, падаюць каву ў пасцель і нават спрабуюць згатаваць што-небудзь крыху больш складанае за яечню. Напэўна, у гэты дзень у іх раскладзе, як у барона Мюнхгаўзена, значыцца «подзвіг». Можа, дзеля аднаго гэтага варта было, каб у календары з'явіўся Жаночы дзень!

І колькі б нядобразычліўцы ні фыркалі (маўляў, і навошта вам, жанчынкі, гэтае ідэйнае свята?), большасці з нас усё роўна, дзякуючы каму і з якой нагоды яно з'явілася. Ці тэкстыльшчыцы Нью-Ёрка, якія працавалі тады па 16 гадзін у суткі, узрушылі свет, ці Клара Цэткін, якая ў 1910-м прапанавала адзначаць Міжнародны жаночы дзень менавіта 8 сакавіка. Галоўнае, яно ў нас ёсць. А калі б не было, мы б усё роўна яго прыдумалі. Паколькі жанчына — ужо свята! Проста мужчыны гэта не заўсёды разумеюць.

Мяркуйце самі. Усяго толькі за атрыманую ў гэты вясенні дзень галінку мімозы (заўважце, не «Інфініці» і не адпачынак на Мальдывах!) мы ім круглы год дорым непараўнальна больш.

Па-першае, усю сябе без астатку, амаль нічога не патрабуючы ўзамен.

Па-другое, тыя самыя пустыя каструлі штодня напаўняем баршчамі, катлетамі, кампотам, памятаючы, што шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз яго страўнік.

Па-трэцяе, пакуль бацькі сямействаў ляжаць на канапах, пацягваючы піва і «хварэючы» за любімую хакейную каманду, мы гадуем іх дзяцей. (Дарэчы, калі ваш сужэнец не лічыць усё вышэйпералічанае працай, можаце пазнаёміць яго з расцэнкамі на паслугі хатняга персаналу. Няхай ведае, у колькі ацэньваецца мыццё бялізны, прасаванне і да т. п.)

І па-чацвёртае, гэта ж менавіта дзякуючы нам мужчыны ні за што атрымалі 8 сакавіка лішні выхадны і нагоду для тоста.

Таму, калі ваш каханы ў чарговы раз пасля святочнага застолля скажа: «Пакінь, дарагая, посуд — сёння ж 8 Сакавіка… Дамыеш яго заўтра», уручыце яму «Fairy» і кучу брудных талерак. Няхай вымые. Хоць раз на год!

Вера ФЕМІНА

■ Нататнік Яго жонкі



Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»

...І ЎВЕСЬ СВЕТ ЛЯ МАІХ НОГ!

Калі б Ён ведаў, як я люблю, едучы з Ім куды б там ні было, зарульваць на заправачныя станцыі!.. Тады Ён, напэўна, мяняў бы маршруты значна часцей, чым мяняе іх цяпер. Спадзяюся. З іншага боку, варыянтаў трапіць з пункта А ў пункт В наўрад ці знойдзецца шмат. Таму я і не кажу Яму пра тое, як я люблю, едучы з Ім куды б там ні было, зарульваць на заправачныя станцыі.

А ўвогуле… Я бачу АЗС асобнай краінай, законы якой пісаліся аднойчы і назаўсёды, рукой хоць і нябачнай, але ўпэўненай у сваім дзеянні настолькі, наколькі ўпэўнена ствараецца іншай нябачнай рукой кожны новы дзень для кожнага з нас. Дакладней сказаць, я бачу АЗС з двух ракурсаў адначасова — і выглядае яна для мяне якраз як гэты нанова створаны для нас дзень: пазіраць на яго зранку — зусім не тое, што ўзірацца вечарам. Я бачу яе чароўнай краінай з назвай у тры літары — амаль як Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, артыкул пра якія я некалі пісала, даўшы яму менавіта такую вось недвухсэнсоўную назву: «За тры моры на тры літары». Артыкул той меў самы любімы мой фармат — рэкламны, і самае цікавае ў ім датычылася кавы, якую там, у Эміратах, можна яшчэ ў аэрапорце піць нейкім звышадмысловым, хоць і не памятаю ўжо, якім дакладна, чынам. Відаць па ўсім, што ў Эміратах мяне зачакаліся, але… На нашых запраўках піць каву можна не менш адмыслова, я так мяркую.

Айчынныя заправачныя станцыі, упэўнена, нічым не выбіваюцца з таго фармату, які даўно прыняты ва ўсім свеце. Асабіста маё бачанне заправак сфарміравалася ў часы павальнага захаплення нашых чытачоў не нашым Чэйзам і не перацярпела дагэтуль аніякіх змен. Мне нават часам здаецца, што АЗС і канструяваліся з улікам рамантыкі прыгодніцкіх гісторый. Купляючы тут проста колу (тавар, якога хапае ў якой заўгодна краме), ты чамусьці не пачуваеш сябе як пакупніца крамы: ты міжволі прымяраеш нейкія ролі. Вось твой спадарожнік працягвае банкаўскую картку хлопцу ў фірменнай бейсболцы. Той кідае на яе позірк, які можа кінуць толькі хлопец у фірменнай бейсболцы, стоячы за прылаўкам у краме на запраўцы — і вось вы са спадарожнікам ужо не вы, а Боні і Клайд. Або Фрэд і Джынджэр. Або Брус Уіліс і Сібіл Шэпард у серыяле «Дэтэктыўнае агенцтва «Святло Месяца».

Мне кожны раз здаецца, што вось падрулім мы да бензакалонкі, і выйду я зараз з машыны, уся такая з сябе а-ля жонка паліцэйскага Тома Лепскі… Але ён, што праўда, і не паліцэйскі, і не Том Лепскі (ну куды да Яго Тому Лепскі?!). Ён… А вось і няма ні ў неўміручага Чэйза, ні ў якога іншага пісакі такога героя, які б мог быць Яму, так бы мовіць, аналагам. Таму лепш так: кожны раз, калі, едучы куды б там ні было, мы зарульваем з Ім на заправачную станцыю, Ён, увесь такі з сябе Рычард Гір (але з вачыма Тома Круза і ўсмешкай Мікі Рурка — грымучая сумесь!), замаўляючы паліва сваёй «Kia», замаўляе мне проста шакалад (хоць і найлепшы з наяўных), я адчуваю, што… як там у Чэйза? Увесь свет ля маіх ног! Ну, або, як мінімум, разгадка таямніцы скарбаў Махараджы чакае мяне ўжо даўно.

Кажучы трошкі іншымі словамі, я неяк аднойчы зразумела: каб для шчасця хапала ўсяго толькі шакаладкі ў сумачцы і паліва ў аўтамабільным баку, трэба, каб побач быў Ён. І каб едучы з Ім куды б там ні было, мы зарульвалі на заправачныя станцыі. І каб не пераводзіліся ролі. Гэта пра тое, што надышла вясна — час адкрываць сезон такіх любімых намі вандровак па Беларусі. І наабяцана ж за зіму так шмат прывабнага! Па-першае, Ён нарэшце навучыць мяне вудзіць рыбу на Віліі. І гэта будзе не менш цікава, чым лавіць ракаў на Бярэзіне ці будаваць пячоркі з пяску на Прыпяці. Спадзяюся.

■ Сакрэтная зброя

ВОДАР ЯК «ДРУГАЯ СКУРА»

Водар — справа сур'ёзная. Ён можа дадаць шарму і давесці вобраз да дасканаласці, а можа няўмольна яго разбурыць.

Загадкавым чынам уздзейнічаюць пахі на нашу падсвядомасць, выклікаюць альбо імгненнае прыцягненне, альбо, наадварот, адштурхваюць. Мужчына значна лепш і даўжэй памятае водар, чым тое, у што вы былі апрануты. Спецыялісты сцвярджаюць, што парфуму мы выбіраем інтуітыўна. І выбар паху выдае амаль усё пра нас: як мы сябе ўспрымаем, якой хочам здавацца і нават які ў нас настрой.

Падабраць духі няпроста — гэта цэлае майстэрства. Адзіны верны дарадчык у такой тонкай справе — ваш… нос. Даверцеся яму. Парфумеры пераканаць: калі вы не «ўлюбіліся» ў духі з першай секунды, то купляць іх не варта. Пры гэтым існуюць яшчэ розныя фактары, якія павінны ўплываць на ваш выбар.

1. Пара года. Пахі, якія будуць радаваць вас ранняй вясной або спякотным летам, могуць зусім не адпавядаць зімовым халадам. Летнімі водарамі лічацца свежыя, кветкавыя, фруктовыя, цытрусавыя і травяныя пахі. У гэты час лепш адмовіцца ад канцэнтраваных духоў і выкарыстоўваць туалетную ваду, тым больш што вытворцы амаль заўсёды выпускаюць духі, туалетную ваду, дэзадарант і нават парфумерны крэм адной лініі.

2. Час сутак. Выбіраючы духі, падумайце: у які час сутак вы маеце намер карыстацца імі. Калі ў вашы планы ўваходзіць «надзяваць» гэты водар раніцай, збіраючыся на працу, то пах павінен быць лёгкім, далікатным.

Удалы пачатак працоўнага дня вам гарантуюць цытрусавыя водары, якія падбадзёраваюць. Для раніцы падыходзяць і свежыя марскія пахі з паветраным азонавым адценнем. А вось водары, у якіх пераважаюць мускусна-амбравыя або рэзкія ноты, лепш выкарыстоўваць у вячэрні час.

3. Ваш настрой. Мяняецеся вы або надвор'е за акном — мяняюцца перавагі. (Дарэчы, пахі і самі па сабе — незалежна ад чалавека — могуць быць загадкавымі, забіякімі, энергічнымі і г. д.) Таму на туалетным століку сярэднестатыстычнай жанчыны ў ідэале павінны стаяць некалькі розных флаканчыкаў — так званы «парфумерны гардэроб». Карацей, зусім не абавязкова быць тут адналюбкай. Хоць многія лічаць, што свой водар трэба выбіраць калі не назаўжды, дык надоўга, каб ён «прырос» да вас і навакольныя лічылі яго «вашым» пахам.

Вы заўсёды павінны памятаць, што скура кожнага чалавека пахне па-асабліваму, з-за хімічнага і мікрабіялагічнага складу яе паверхні. Тлустая, вострая ежа надае скуры больш інтэнсіўны пах. Яшчэ больш на ўласцівасці вашай скуры могуць паўплываць лекавыя прэпараты, вітаміны і іншыя фармакалагічныя прэпараты, якія вы ўжываеце. Таму адзіны чалавек, які адчуе, што водар вам «пасуе», — вы самі.

Цяпер, калі выбар зроблены, самы час даведацца, як правільна карыстацца духамі.

✓ Наносьце парфуму 2–3 кроплямі на тыя часткі цела, дзе лёгка прамацаць пульс. Чаму? Біццё пульсу даваляе водару хутчэй і лепш выпарацца. Гэта запясці і локцевыя згібы, плечы, а таксама лагчынка на шыі, скроні. Яшчэ адна кропка — за мочкамі вушэй, ля каранёў валасоў: там даўжэй за ўсё захоўваецца пах. І не забывайце, што, развіваючыся, водар падымаецца ўверх — таму ёсць сэнс папырскаць ім шчыкалаткі і калені.

✓ Памятайце: больш гарманічна водар праяўляецца на натуральных тканінах. У шарсцяных і футравых рэчах пахі захоўваюцца гадамі. На светлых тканінах духі могуць пакідаць плямы, а шэрсць і мех могуць страціць колер, таму «душыць» адзенне трэба з унутранага боку.

✓ Усё добра ў меру: нават самыя вытанчаныя і дарагія духі стануць невыносным для навакольных, калі іх будзе занадта шмат.

Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ДАРЭЧЫ

Французскія парфумеры рэкамендуюць выбіраць духі наступным чынам: спачатку пакласці абрэзак тканіны ў бюстгальтар і панасіць яго там некалькі дзён. Затым, наведаўшы магазін, папырскаць на тканіну ўпадабанымі духамі, а пасля пакласці яе назад. Вызначыцеся, ці камфортна вы адчуваеце сябе «ў новым водары».

Зразумела, універсальнага адказу на пытанне: «Якія водары больш за ўсё падабаюцца мужчынам?» — быць не можа. Аднак апошнія даследаванні па гэтым пытанні дазваляюць зрабіць наступныя высновы: не менш за самую вытанчаную парфуму нашым мужчынам падабаюцца натуральныя пахі, якія выклікаюць у іх адчуванне цеплыні і ўтульнасці.

Як вы думаеце, пад які пах любяць прачынацца раніцай мужчыны? Вядома ж, гэта духмяны, натхняльны **пах кавы!** У большасці мужчын гэты водар асацыюецца з сонечнай раніцай, энергіяй «патрэбнага» настрою, які дапамагае ім прачнуцца і ўзбадзёрыцца. А што прыцягвае мужчын, якія прывыклі да ўтульнасці роднага дома? Гэта **пах свежай выпечкі.** У большасці з нас ён выклікае ўспаміны аб далёкім, бесклапотным дзяцінстве, мае непарыўную сувязь з адчуваннем спакойнай, прыязнай атмасферы ў доме, надзейным хатнім тылам… У большасці прадстаўнікоў моцнага полу хатняя ўтульнасць асацыюецца і з **пахам ванілі.** Але з гэтым водарам трэба старацца не перабаршчыць, каб не атрымалася ўсё прыкра-салодкім — дастаткова тонкага, ледзь улоўнага паху.

Такім чынам, нам, жанчынам, цалкам па сілах напоўніць свой дом прыемнымі сэрцу мужчыны водарамі, якія будуць нябачна прыцягваць яго.

І ўсё ж — што менавіта іх «заводзіць»?

На што «вядуцца» мужчыны?

▸ Няма больш прывабнага для мужчыны паху, чым пах чыстага жаночага цела.

▸ Цікава, што амаль кожны чацвёрты прадстаўнік моцнай паловы чалавецтва проста-такі вар'яцее ад задавальнення, калі часам жанчына наносіць на сябе яго ўласны любімы водар. «Пазначаючы» сябе ЯГО водарам, жанчына дае зразумець, каму яна належыць.

▸ Водары мускусу, амбры, язміну, падобныя да натуральнага паху жанчыны, хаваюць у сабе незвычайную здольнасць абуджаць сексуальнае жаданне ў мужчыны.

▸ Усходнія пачуццёвыя водары з ноткамі карыцы, сандалу, пачулі, лілеі, архідэі здольныя распаліць агонь нават у самым халодным сэрцы. Яны бударажаць фантазію прадстаўнікоў моцнага полу, разнявольваюць, ствараюць эратычны настрой.

▸ А вось водары «ўнісекс» (прызначаны для маладых, актыўных прадстаўнікоў абодвух полаў) можна смела назваць абсалютнымі аўтсайдарамі. Гэтыя пахі не выклікаюць у мужчын ніякіх эмоцый.

■ Псіхалогія адносін

Супраць каго сябруем?

Плёткі, інтрыгі… Усё гэта — неад'емная частка жаночага калектыву. Але гэта — з аднаго боку і тады, калі з калектывам не пашанцавала. З іншага — калі, наадварот, месца працы ператвараецца ў яшчэ адзін родны дом. Тут табе заўсёды паспачуваюць, уважліва выслухаюць і нават — пры дапамозе жаночага калектыўнага розуму — дапамогуць выйсці з любой, самай складанай сітуацыі.

Асабіста мне даводзілася працаваць у розных калектывах: як цалкам жаночых, так і мужчынскіх. Скажу па сакрэце: адрозненні амаль незаўважныя. Напрыклад, калі гаварыць пра тое, хто больш схільны інтрыгаваць і распускаць плёткі, дык (няхай мужчыны даруюць!) за прадстаўнікамі моцнай паловы гэты недахоп заўважала куды часцей, чым за жанчынамі. І няпраўда, што мужчыны не любяць слухаць плёткі! А інтрыгаваць — гэта ў іх і наогул у крыві! Апошняе, напэўна, звязана са стагоддзямі палітычных інтрыг, у якіх мужчыны амаль заўсёды адыгрывалі больш значную ролю, чым слабая палова, прадстаўніцы якой толькі і маглі, што каго-небудзь атруціць цішком ці спакусіць.

Так што мужчыны — «за» інтрыгі. Мне вельмі часта даводзілася чуць расповеды пра тое, як мужчыны прыдумвалі такія інтрыгі і плёткі, да якіх жанчыны проста… не дадумваліся.

Тацціяне было 20 «з хвосцікам», калі яна ўладкавалася на працу ў адну хіміка-біялагічную навуковую ўстанову. Прадстаўніц прыгожай паловы на яе працы было адна-дзве і аблічыўся. (Спачатку дзяўчына нават узрадавалася гэтаму.)

Непасрэдным кіраўніком Тацціяны быў трыццацідвухгадовы перспектыўны навуковец Андрэй Міхайлавіч. Дарэчы, прыгожы. Да таго ж яшчэ і нежанаты.

Праз паўгода сумеснай працы Тацціяна пачала заўважаць, што кіраўнік да яе заляцаецца. І хаця яна была скіравана на тое, каб зрабіць кар'еру, крыху паразважаўшы, вырашыла, што ў такой сувязі нічога кепскага няма.

— А потым, як звычайна гэта здараецца, — успамінае Тацціяна, — неяк надоўга затрымаліся на рабоце і… упершыню пацалаваліся.

Так і пачаўся раман. Кожны дзень на працу дзяўчына не ішла, а ляцела на крылах. Прайшло яшчэ паўгода. А потым высветлілася, што Андрэй Міхайлавіч выкарыстаў іх сумесныя лабараторныя эксперыменты ў сваёй навуковай працы і… ніводным словам нідзе не ўзгадаў, што яна таксама мела да гэтага дачыненне. Калі Тацціяна запыталася, чаму так здарылася, ён паціснуў плячыма і адказаў: «А што такога асаблівага ты зрабіла, каб быць уключанай у суаўтарства?»

— У той час, як я — закаханая дурніца — марыла аб сумеснай будучыні, ён проста мяне выкарыстоўваў, — гаворыць Тацціяна.

Далей — болей. Андрэй Міхайлавіч проста пачаў выжываць яе з установы. То ў дзяўчыны раптам «знікалі» вынікі эксперыменту, то раптоўна выходзіла са строю абсталяванне, то дзверы лабараторыі ў час, калі Тацціяна павінна была там знаходзіцца, аказваліся зачыненымі і ніхто не мог знайсці ад іх ключоў. А потым ён і наогул пачаў страчыць службовыя запіскі з нагоды яе спазненняў з абеду ці раніцай на працу. Аднойчы Тацціяне было неабходна адпрасіцца па сямейных абставінах. Ён, вядома, адпусціў, але ў той жа дзень напісаў, што Тацціяна па невядомай яму прычыне не выйшла на працу. У выніку пытанне было пастаўлена так, што дзяўчына альбо звальняецца сама, альбо яе звальняюць за прагул. І Тацціяна была вымушана змяніць месца работы.

У адрозненне ад вышэйапісанага выпадку, начальніца Анжалікі з самага пачатку не імкнулася маскіравацца.

— Было гэта так, — узгадвае Анжаліка. — Я аформілася, а праз пару дзён Галіна Васільеўна выклікала мяне да сябе і сказала, што на фірме я… не затрымаюся.

Анжаліка да сённяшняга дня памятае дэталёва, як яе навaспечанае кіраўніцтва даводзіла ёй, што, маўляў, «ведае дзеля чаго яна ўладкавалася сюды на працу».

Галіна Васільеўна чамусьці была ўпэўнена, што Анжэла прыйшла на фірму, бо… паквапілася на шэфа.

— А ты ведаеш, што ён жанаты і ў яго двое дзяцей? — ушчувала яна Анжаліку.

Як высветлілася пазней, калісьці Галіна Васільеўна была ў шлюбе з мужчынам, якога звяла з сям'і маладзейшая падначаленая. Вядома, лічыць Анжаліка, жанчыне не пазайздросціш: ёй адной прыйшлося падымаць дзяцей. «Але ж я тут пры чым? Не ўсе ж жанчыны адбіваюць мужоў у жонак!».

Дарэчы, сваё абяцанне Галіна Васільеўна выканала. Анжаліка сапраўды на працы затрымацца не здолела. Як і Алена. Праўда, апошняя «ўтрымлівала абарону» тры гады.

У Алены не склаліся адносіны з адным з намеснікаў кіраўніка ўстановы. Вядома ж, намеснікам была жанчына.

— Інтрыгаваць Вольга Генадзьеўна пачала праз паўгода, — расказвае дзяўчына. — Мабыць, баялася за сваю пасаду і бачыла ўва мне канкурэнтку, хаця я з ёй канкурыраваць зусім не збіралася.

Механізм плётак і інтрыг у бок Алены запусціўся дзякуючы сімпатыі з боку шэфа да яе як да падначаленай. Ды і ён, шчыра кажучы, таксама падабаўся ёй як кіраўнік: добра адукаваны, з высокім узроўнем інтэлекту, з адметным гумарам. Інакш кажучы, з ім заўсёды было прыемна пагутарыць.

Што датычыцца Вольгі Генадзьеўны, то за яе спінай шапталіся, што яна была даўным-даўно безадказна закаханая ў шэфа. І з гэтай нагоды некалі выпіла нямала крыві ў адной з супрацоўніц, з якой той уздумаў «закруціць раман».

— Што датычыцца мяне, то, напрыклад, адна з супрацоўніц неяк падзялілася, што Вольга Генадзьеўна паабяцала «ліквідаваць» мяне любой цаной, — узгадвае Алена.

Другая супрацоўніца, Юлія, таксама перадала Алене, што Вольга Генадзьеўна не лічыць неабходным нават маскіраваць сваё негатыўнае стаўленне да яе.

— Яна цябе не любіць, — казала Юлія. — Я тут была неяк на сустрэчы з партнёрамі, дзе вельмі хвалілі тваё падраздзяленне, прыехала на працу і паведаміла пра гэта Вользе Генадзьеўне. Яна сказала, што калі я падзялюся гэтым з шэфам, то мне мала не падасца.

Алена, зразумела, таксама не здавалася: раз за разам імкнулася даказаць шэфу, што яе прыцэнкаюць. Каштавала гэта вялікай энергіі і высілкаў. А потым дзяўчына падумала: ну колькі ж можна выконваць ролю вінаватай?.. І прыняла рашэнне сыходзіць.

— Да мяне, — кажа яна, — засталося без адказу толькі адно пытанне: як разумны, дарослы і вопытны мужчына не ўбачыў, што Вольга Генадзьеўна яго проста раўнуе? Чаму ён як кіраўнік столькі гадоў не заўважаў, што ў яе раз за разам узнікаюць «праблемы» менавіта з тымі супрацоўніцамі, да якіх ён ставіцца са шчырай сімпатыяй? А яшчэ лічыў сябе добрым псіхолагам!..

Алена КАВАЛЁВА.

Наш каментарый

«Не вінаватая я!»

Лілія АХРЭМЧЫК:

— Што рабіць, калі адносіны ў жаночым калектыве па розных прычынах не складваюцца: змагацца ці сыходзіць?.. Лічу, што ўсё ж такі неабходна паспрабаваць знайсці ўзаемаразуменне з калектывам. Паспрабуйце гаварыць жанчынам-калегам камплiменты, прапануйце пачастункі, пачніце сябраваць… У гэтым могуць дапамагчы агульныя тэмы для размовы: пра дзяцей, адносіны, каханне, кіно, адпачынак, кулінарыю. Пры гэтым не паводзьце сябе пасіўна, а спытайце парады — у адной, другой, трэцяй, папрасіце дапамогі. Так, глядзіш, адносіны і складуцца. Заўсёды знойдуцца людзі, якім канфрантацыя падасца менш цікавай, чым сяброўства.

Калі ж нічога не атрымліваецца і пераадоленне канфлікту патрабуе ад вас занадта вялікага напружання і выдаткаў, сыходзьце! У рэшце рэшт, вы прыйшлі працаваць, а не весці баявыя дзеянні.

Нярэдка, калі шэф малады і прыгожы, даводзіцца сутыкацца з сітуацыямі, што ў яго закахана палова жаночага калектыву, у тым ліку, напрыклад, адна з жанчын-намеснікаў. Што рабіць, калі да вас пачынаюць раўнаваць?.. Выйсце адно: ідзіце на прамую размову з шэфам. У час гэтай гутаркі паспрабуйце яму растлумачыць, што паводзіны калегі адцягваюць вашу ўвагу ад выканання абавязкаў, ствараюць у калектыве дрэнны мікраклімат і з-за гэтага паменшаецца эфектыўнасць агульнай працы. І пастарайцеся не даваць падстаў для рэўнасці, а шэф ужо няхай сам разбіраецца са сваімі фаварытамі.

Што рабіць, калі нехта ў калектыве распаўсюджвае плёткі аб тым, што ў вас раман з шэфам?.. Ваша рэакцыя будзе залежаць ад таго, праўда гэта ці не. Калі праўда, то людзі толькі канстатуюць факт і вам крыўдзіцца няма на што. Калі такіх падстаў няма, паспрабуйце пагаварыць сам-насам з чалавекам, які іх распаўсюджвае. Неабходна зразумець прычыны, па якіх ён гэта робіць, каб абараніцца ад нагавораў. І, безумоўна, не паводзьце сябе так, быццам плёткі адпавядаюць рэчаіснасці, калі насамрэч гэта не так. Доказам таго, што вы ні ў чым не вінаватая, стануць ваша сумленная праца і поспехі.

Яшчэ адно вельмі важнае пытанне: ці трэба адказваць на пачуцці мужчыны-калегі, мужчыны-начальніка?.. Тут ужо многае залежыць ад таго, якія мэты вы перад сабой ставіце. Так бы мовіць, вызначайцеся з прыярытэтамі. Калі ваша сённяшняя работа — вынік шматгадовых цяжкіх намаганняў і рамантычныя адносіны вам пакуль не патрэбны, то паводзіць сябе з мужчынам неабходна па-дзелавому, захоўваць дыстанцыю. Калі ж вы адчуваеце, што паміж вамі і мужчынам не проста інтрыжка, а больш глыбокія і шчырыя пачуцці, то, мабыць, лепш выбраць мужчыну. І дай Бог, каб гэты чалавек таксама закахаўся ў вас — тады ён можа стаць вашым мужам і бацькам вашых дзяцей. А гэта значна важней, чым любая работа. Аднак перш чым аддацца пачуццям, упэўніцеся ў тым, што перад вамі дастойны мужчына, што ў яго сур'ёзныя намеры, уважліва прыглядзіцеся да яго: ці не выкарыстоўвае ён вас у сваіх мэтах?

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Пачынаецца спрыяльны перыяд, які дасць новыя кар'ерныя магчымасці. Калі зможаце імі скарыстацца па максімуме і працаваць рупліва, то вынікі перасягнуць усе вашы чаканні. Прафесійная актыўнасць узрасце, што павінна пацягнуць за сабой прапановы новай перспектыўнай працы. Усё гэта дасць магчымасць узняцца на наступную фінансавую прыступку.

ЦЯЛЕЦ. Для таго, каб тыдзень прайшоў спакойна і плённа, паспрабуйце пазбягаць спрэчак, нават калі яны закрануць пытанні вашай прафесійнай кампетэнтнасці. Верагодна з'яўленне нязначных цяжкасцяў, звязаных, перш за ўсё, з працай. Пераважней дзейнічаць самому, звяртаючыся да чужых парад толькі ў выключным выпадку. Не бойцеся магчымых змен у сваім жыцці. Памятайце, што ўсё робіцца толькі да лепшага.

БЛІЗНЯТЫ. Не варта даваць абяцанняў: выканаць іх у тэрмін можа не атрымацца. Рэкамендуецца сур'ёзна задумацца пра будучыню. Некаторыя вашы творчыя задумы пачнуць ажыццяўляцца. Паспрабуйце быць уважлівымі да блізкіх людзей: яны могуць мець патрэбу ў падтрымцы. У суботу сустрэча з сябрамі акажацца на рэдкасць прыемнай і плённай.

РАК. Тыдзень будзе спрыяць завяршэнню назапашаных спраў. Выявіце ўласцівую вам добрасумленнасць і пунктуальнасць. Звярнуцца асаблівую ўвагу на дробязі — гэта дазволіць пазбегнуць памылак. Паспрабуйце менш крытыкаваць калег, бо часам маўчанне цэніцца на вагу золата, а калегі і так зразумеюць свае прамашкі і недахопы.

ЛЕЎ. Надыходзіць выдатны час для кар'ернага росту і творчых распачынанняў, якія спрыяюць раскрыццю вашага патэнцыялу. Будзьце прадбачлівыя, не ўступайце ў канфлікт з начальствам, а пайдзіце на разумны кампраміс, бо, плывучы супраць плыні, вы будзеце марнаваць шмат сіл, атрымліваючы нулявы вынік.

ДЗЕВА. Поспех цяпер на вашым баку, аднак пачатак тыдня можа прыглушыць голас розуму, аддаючы перавагу голасу сэрца. У панядзелак з сітуацыяй вам дапаможа саўладаць толькі прыроднае пачуццё гумару. Паездкі з практычнымі мэтамі будуць удалымі ў сераду.

